№ 23 (668) 23 чэрвеня 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Не забудзьцеся падпісацца на другое паўгоддзе**

Старонка 2



**Партызанская вайна супраць міліцыі**

Старонка 7



**Тэатр імя Дыега Марадоны**

Старонка 6

## У НУМАРЫ

**Дзяржава для народа, а гатэлі для сябе**

Ціхая прыватызацыя як сродак экспрапрыяцыі нацыянальнага багацця: многія элітныя гасцініцы Мінска належаць Кіраўніцтву справаў прэзідэнта. **Старонка 4.**

**Ці пан, ці правал**

Прэм'еры ў Купалаўскім тэатры і Музкамедыі: «Тэатраманія» і «Мефіста». Пішуць Павал Касцюкевіч і Юлія Андрэева. **Старонка 11.**

**Голая праўда**

Вострасатырычнае апавяданне. Піша Аляксандр Апон. **Старонка 12.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА
«ГІСТОРЫЯ-ТУР»
600-годдзю «Грунвальдскай Бітвы» прысвячаецца
Тур «Шлях на Грунвальд»
Лідзбарк Вармінскі – Ольштын – Мальбарк – Грунвальд 13-18.07.2010
Цана: ад 120 еўра (усё ўключана)
(029) 677 00 46 www.h-t.by
УНП 590883064. Лц. № 02310/0535453 г. МСіТ выд. 21.09.2009 да 21.09.14

# Расія паказвае Лукашэнку яго месца

Газавым шантажом Беларусь уцягваюць у Мытны саюз — аснову новага СССР.

Вечарам у панядзелак віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка заявіў, што з запазычанасцю краіны расплаціцца цягам двух тыдняў, бо ў краіне складана з валютай. У аўторак Лукашэнка заявіў, што Беларусь дамовілася пра пазычанне грошай, неабходных для аплаты запазычанасці, «у сяброў». **Старонка 3.**



PHOTO.BYMEDIA.NET




## Беларусь можа стаць газавым Эльдарада

Тэхналогія здабычы сланцавага газу адкрывае новыя перспектывы. **Старонка 8.**



КАМЕНТАР РЭДАКЦЫІ

# Лепш дарагі газ, чым Мытны саюз

Не ў 200 мільёнах запазычанасці прычына газавай вайны — Расія адтэрміноўвала і большыя пазыкі.

А ў чым жа? Хочуць скалупнуць Лукашэнку? Пасол Сурыкаў ясна прызнаў, што лічыць гэта нерэальным. Беларуская палітычная эліта, бюракратычны апарат і сілавыя структуры скансалідаваныя і праплачаных Масквой пераваротаў не дапусцяць.

Толькі адна рацыянальная прычына бачыцца для заварухі: Мытны саюз. Ён уяўляецца Пуціну асновай будучага Еўраазіяцкага саюза — доўгатэрміновага ўтварэння, у якім Расія будзе дамінаваць. Такое сабе творчае пераасэнсаванне вопыту ЕС, які паўстаў з Еўрапейскай эканамічнай супольнасці, пад патрэбы будаўніцтва сучаснай імперыі.

Калі Беларусь трапіць у саладуху Мытнага саюза, у яе не застанецца магчымасці для еўрапейскай эканамічнай інтэграцыі. Раз мытаў не будзе на Усходзе, яны будуць на Захадзе.

У палітычным і культурным выніку гэтага будзе менш шанцаў дафармаваць нацыю.

Як ні парадаксальна, выбар таннага газу на доўгатэрміновую перспектыву таксама эканамічна стратны.

Лепш дарагі газ, чым Мытны саюз. Як паказала найноўшая гісторыя, на доўгіх адрэзках часу суседзям Расіі эканамічна больш выгадна быць Фінляндыяй, чым рэспублікай-сястрой.

Усе гэтыя газавыя танцы з зоркамі патрэбны толькі для таго, каб дысцыплінаваць Лукашэнку і змусіць яго падпісаць Мытны кодэкс — паламаецца на публіку, для электарату, і падпіша, як васал. Як падпісаў здачу «Белтрансгаза» і дамову па КСАР. Масква не мае іншых задач на сёння — прынамсі, яны не заўважныя. Таму і лідэрам апазіцыі трэба дзейнічаць адпаведна. Гаварыць праўду, як адна з яе ініцыятываў заклікае.

Што да лукашэнкаўцаў, дык газавыя танцы даюць ім чарговую магчымасць ад Мытнага саюза ўхіліцца. З усімі выцякаючымі.

**Андрэй Дынько**

# На фэсце «Наваградскі замак» можна пабачыць «Грунвальдскую бітву» Матэйкі

Найцікавейшае з праграмы фэсту сярэднявечнай культуры 25—27 чэрвеня.

### 26 чэрвеня

**Гарадская плошча:**

**12.40—13.00:** Тэатралізаванае шэсце: князь Вітаўт і кароль Ягайла на конях у атачэнні світы; прадстаўнікі рыцарскіх клубаў; творчыя калектывы.

**13.00—14.00:** Адкрыццё свята.

**21.00—24.00:** Гала-канцэрт вядучых калектываў і выканаўцаў Беларусі.

**24.00:** Феерверк.

**Замкавая гара (платныя мерапрыемствы):**

**12.00—24.00:** «Рысталішча»: паказальныя выступленні клубаў ваенна-гістарычнай рэканструкцыі, каскадзёраў, музыкаў.

**12.00—13.15, 16.00—17.15:** Клуб «Viduramziu pasiutiniai» («Сярэднявечныя вандроўнікі») — Літва (уваходны білет — 15 000 бел. руб.).

**14.00—15.15, 18.00—19.15:** Студыя гістарычных праграм і пастановачных баёў «Berounsti mestane» («Бераўнскія мяшчане») — Чэхія (уваходны білет — 15 000 бел. руб.).

**22.00—24.00:** Спектакль прыдворнага балета «Cracovia Danza» — Польшча і фаер-шоу (уваходны білет — 25 000 бел. руб.).

**Роў ля Замкавай гары:**

**11.00—16.00:** Беларускі этап адкрытага Кубка Еўропы па гістарычным фехтаванні.

**17.00—19.00:** Конны турнір.

**19.00—19.30:** Рыцарскія бугурты.

**Малы замак:**

**12.00—19.00:** Сярэднявечная кухня і кірмаш.

**12.00—13.00, 15.00—16.00, 18.00—19.00:** Дэманстрацыя сярэднявечных упрыгожанняў.

**13.00—14.00, 16.30—17.30:** Спектакль «Батлейкі» «Здані з батлеечнай скрыні».

**Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку:**

Калектыўная фотавыстава «Успамін пра Грунвальд».

**Навагрудскі гістарычна-краязнаўчы музей:**

Электронная прэзентацыя: «Эпоха Вітаўта і Ягайлы». Выстава адной карціны: Ян Матэйка «Грунвальдская бітва».

### 27 чэрвеня

**Гарадская плошча:**

**15.00—18.00:** Выступ аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.

**18.00—18.30:** Урачыстае закрыццё свята.

**Замкавая гара (платныя мерапрыемствы):**

**12.00—16.00:** «Рысталішча»: паказальныя выступленні клубаў ваенна-гістарычнай рэканструкцыі, каскадзёраў, музыкаў.

**Роў ля Замкавай гары:**

**11.00—15.00:** Турнір лучнікаў.

**16.00—17.00:** Інсцэнізацыя, прысвечаная 600-годдзю Грунвальдскай бітвы.

На перыяд свята ў в.Сялец (2 км ад Навагрудка) будзе дзейнічаць платная ўладкаваная пляцоўка (асвятленне, крынічная вада, вогнішча з дровамі, прыбіральні, неахоўваемая аўтастаянка) для размяшчэння намётавага гарадка.

З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

# Падгол Някляеву: «Кроў паэта — гэта вершы, якія ён мусіць здаваць народу»

Прачытаў, што некалькі дзясяткаў актывістаў руху «Кажы праўду» ў Сусветны дзень донара здалі кроў. Пазваніў паэту і спытаў: а ці стаў ён у той дзень донарам? Паэт распавёў, што у яго кроў не ўзялі, бо ён прыехаў з вялікай тэмпературай. Узгадаў, што яго сябры і кроў здалі, і раздалі медычным сястрычкам кніжкі з вершамі Някляева.

Падумаў я і сказаў Уладзіміру Пракопавічу, што кроў паэта — гэта вершы, якія ён мусіць здаваць народу.

Ён пагадзіўся.

Паболей бы такіх акцыяў з падарункамі вершаў ці, вобразна кажучы, здачы паэтычнай крыві народу. Тады б яны ратавалі кроў нацыі, якую псуе дыктатар і яго паслугачы.

**Уладзімір Падгол**


Юлія Дарашкевіч

**У аўторак Уладзімір Някляеў збіраў у Гродне подпісы за перайменаванне адной з вуліц у вуліцу Васіля Быкава.**

## Сціссла

**• Міліцыя не выключае, што з Мытным саюзам узрасце наркатрафік праз адкрытую ўсходнюю мяжу Беларусі.** Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі 22 чэрвеня начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Аляксандр Гаўрылаў.

**• Экс-кіраўнік адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Мінска Міхаіл Цыган прысуджаны да 8 гадоў пазбаўлення волі.** У аўторак у Мінскім абласным судзе быў абвешчаны прысуд. Цыган прызнаны вінаватым у атрыманні хабару, перавышэнні ўлады або службовых паўнамоцтваў, незаконных дзеяннях у дачыненні да зброі і боепрыпасаў. У той жа час суд прызнаў экс-кіраўніка невінаватым па абвінавачванні па ч.2 арт.210 («Крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі») з прычыны адсутнасці складу злачынства.

**• Украінскае агенцтва MPP Consulting склала першы ТОП-100 самых дарагіх брэндаў Беларусі.** У першую сотню ўвайшлі брэнды, якія каштуюць больш за мільён даляраў. Вось сямёрка найлепшых з іх: 1) «Мілавіца» — $60 мільёнаў, 2) «Санта-Брэмар» — $57,5 мільёна, 3) Conte — $53 мільёны, 4) «Аліварыя» — $48 мільёнаў, 5) Velcom — $46,8 мільёна, 6) «Бульбашъ» — $45,2 мільёна, 7) «Савушкаў прадукт» — $43,5 мільёна. Стваральнікі ўдакладняюць, што кошт брэнду ўключае ў сябе толькі імя, без уліку прамысловых магчымасцяў і інфраструктуры кампаніі.

**• Станіслава Шушкевіча ўзнагародзілі Ордэнам Вітаўта Вялікага.** Ордэн будзе ўручаны першаму кіраўніку незалежнай Беларусі ў Дзень літоўскай дзяржаўнасці.

**• На сцэне 21-га «Басовішча» выступіць 21 гурт.** Традыцыйны фэст беларуская року пройдзе ў Гарадку пад Беластокам 16—17 ліпеня. Фэст чакаюць змены: бар перастворыцца ў пясчаны бераг, намётавы гарадок паўстане ў іншым месцы, з'явіцца кінасцэна, а таксама прадугледжаны «нефармальны трэці дзень» фэсту.

**• Дажджы з навальніцамі.** 24—25 чэрвеня на большай частцы Беларусі кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ноччу плюс 10—17°С, па ўсходзе 18—20°С, днём ад 16°С на захадзе да 30°С — па ўсходзе краіны.

**МБ**

### Самае чытанае на nn.by за 16—22 чэрвеня

- Альтэрнатыўны ўрад заслухаў прэзідэнтаў
- «Яго адрас: Міханавіцкія могілкі...»
- Чаму некаторыя жанчыны не любяць сэкс?
- Жудаснае ДТЗ на МКАД: загінулі шэсцьчалавек
- Лукашэнка зноў апелюе да акопаў апошняй вайны
- Гаспадар маёнтка Матусевічы
- Што расійцу добра, то беларусу — вілы
- Офісная апазіцыя
- Найстаражытнейшы дакумент Кіеўскай Русі знайшлі ў сінагозе (анонс)
- Бітва на Нямізе (падушкамі) відэа

### nn@nn.by

З тымі ж краінамі ЕС «Газпром» працуе не па абстрактна сусветных цэнах на газ. Гэтыя цэны абгаворваюцца з кожнай краінай (чытай: мясцовай газавай кампаніяй) асобна.

**wint**

**Наталля Машэрава:** Грамадства наша не гатова абраць прэзідэнтам жанчыну. Пры такой сістэме жанчына не можа быць запатрабавана. Спантанна ў Беларусі жанчына на пасаду прэзідэнта не прыйдзе, а іншых варыянтаў пакуль не прадбачыцца.

**«Тут і цяпер»**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй

Ігару Г. з Мінска

за ахвяраванне на дзейнасць інтэрнэт-сайта «НН».

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Святлане Д., Рычарду С., Аляксею Д., Віктару Ш., Анатолю В., Валянціне Г., Альфрэдзе З., Сяргею Г. з Мінска, Мікалаю І., які цяпер у Вільні.

# У газавых акопах

**Чарговая гандлёвая вайна паміж Беларуссю і Расіяй: магчымыя непрадказальныя наступствы.**

Чарговая газавая вайна паміж Беларуссю і Расіяй выбухнула летам. Праз некалькі дзён пасля візіту Лукашэнкі ў Маскву.

Меркавалася, што на той сустрэчы будзе дасягнутая дамоўленасць адносна падпісання нашай краінай дамоваў аб Мытным саюзе. Аднак 15 чэрвеня ў Расіі раптоўна ўспомнілі, што Беларусь мае запазычанасць за газ. Афіцыйнаму Мінску далі пяць дзён, каб гэты доўг пагасіць. Упершыню гэта прагучала на сустрэчы кіраўніка «Газпрома» Аляксея Мілера з прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым. У адваротным выпадку «Газпром» паабяцаў адключыць газ. Такое ў найноўшай беларускай гісторыі ўжо бывала.

Адкуль з'явілася такая сітуацыя? Расійскі бок сцвярджае, што беларусы працягваюць плаціць за газ па леташняй цане. Мілер кажа, што Мінску былі перададзеныя 2,5 мільярда даляраў за набыццё акцый «Белтрансгаза», таму грошы ў Беларусі ёсць.

Запазычанасць Беларусі складае амаль 200 мільёнаў даляраў. Мілер пагражае, што адключанымі будуць 85% паставак газу, астатнімі 15% будзе магчыма падтрымліваць у рабочым стане газатранспартную сістэму.

Першыя дні канфлікту Беларусь прамаўляла збольшага вуснамі намесніка міністра энергетыкі Эдуарда Таўпянца. А ён казаў, што доўг Беларусі за газ роўны доўгу Расіі за транзіт, таму ніхто нікому не вінаваты.

Беларуская дэлегацыя ў тэрміновым парадку накіроўвалася ў Маскву на перамовы. Журналісты запыталіся ў Мілера, чым яны скончыліся. «Нічым», — каротка рэзюмаваў кіраўнік «Газпрома».

«У Мілера не было жадання прыняць разумныя, узважаныя рашэнні», — заявіў Э.Таўпянец.

Расія слова стрымала. Праз пяць дзён пасля пастаўленага ўльтыматуму газу ў Беларусь пачало паступаць на 15% меней. У аўторак гэты паказчык павялічыўся да 30%.

> «Калі нас пачынаюць зневажаць ці то катлетамі, ці то каўбасой, маслам і блінамі, мы гэта ўспрымаем як абразу беларускага народа».

Яшчэ ў панядзелак «Газпром» накіраваў паведамленне Еўрапейскай камісіі пра верагодныя праблемы з транзітам газу ў Еўропу праз абмежаванне паставак у Беларусь.

Як у ваду глядзелі. У аўторак падчас сустрэчы з міністрам замежных справаў Расіі Сяргеем Лаўровым Лукашэнка распарадзіўся перакрыць транзіт расійскага газу цераз Беларусь.

«Неканструктыўная пазіцыя «Газпрома» і далейшае скарачэнне расійскім бокам паставак газу ў Беларусь можа прывесці да тэхнічнага памяншэння транзіту газу ў Еўропу», — напісала Міністэрства энергетыкі ў лісце да дырэктара па агульнай палітыцы Еўракамісіі па энергетыцы і транспарце Ганны Гутман.

Паводле Лукашэнкі, заявы кіраўніцтва Расеі зневажаюць беларускі народ. «Хачу публічна вас праінфармаваць пра той канфлікт, які перарастае ў газавую вайну паміж «Газпромам» і Беларуссю. Кажуць, што гэта спрэчка гаспадарчых суб'ектаў, але я не разумею, як тады такая спрэчка можа перарасці на ўзровень вышэйшага палітычнага кіраўніцтва краіны. Выбачайце, але калі нас пачынаюць зневажаць ці то катлетамі, ці то каўбасой, маслам і блінамі, мы гэта ўспрымаем як абразу беларускага народа. Так не належыць весці сябе прэзідэнту, у тым ліку суседняй саюзнай дзяржавы», — заявіў А.Лукашэнка.

Вечарам у панядзелак віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка заявіў, што з запазычанасцю краіны расплаціцца цягам двух тыдняў, бо ў краіне складана з валютай. Расію гэта не задаволіла, яны патрабуюць імгненнага падвядзення рахункаў. Беларусь ужо разлічылася за газ, што быў выкарыстаны ў маі. У аўторак Лукашэнка заявіў, што Беларусь дамовілася пра пазычанне грошай, неабходных для аплаты запазычанасці, «у сяброў».

Па стане на аўторак не відавочна, якім чынам гэтая сітуацыя можа выруліцца бліжэйшым часам. Расія дабіваецца падпісання ад Беларусі Мытнага саюза такімі непапулярнымі сродкамі. Беларусь жа настойвае на поўнай адмене нафтавых пошлін. Адключэнне газу чарговы раз балюча б'е па рэпутацыі Расіі ў свеце.

Чаму ж наша ўсходняя суседка так дабіваецца ад Беларусі падпісання гэтых пагадненняў? «Мне здаецца, што Мытны саюз мае не эканамічны, а палітычны, ідэалагічны аспект», — кажа эканаміст Павел Данейка.

Некалі Еўрасаюз таксама пачынаўся з мытнай прасторы. Праз Мытны саюз Расія ўцягвае Беларусь яшчэ больш у сферу свайго доўгатэрміновага кантролю і аддаляе ад Еўрасаюза.

Ці выгадны Лукашэнку такі канфлікт? «Думаю, выгадны. Лукашэнка добра адчувае сябе ў скандалах», — кажа палітолаг Віталь Сіліцкі. Што трэба рабіць, каб Расія не магла так умешвацца ва ўнутраныя справы Беларусі? «Плаціць па поўнай. Думаю, што гэта магчыма, трэба толькі крыху напружыцца».

Падчас такіх канфліктаў Лукашэнка ўключае рытoрыку, што ў гады вайны мы з расіянамі гнілі ў адных акопах. Гаварыў ён пра тое і цяпер. Вайна вайной, а газ газам. І ў газавых акопах мы знаходзімся па розныя бакі барыкад.

**Зміцер Панкавец**

**Някляеў: За газ трэба плаціць**

Лідэр кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў пра газавы канфлікт, паводзіны Лукашэнкі і Крамля:

«Калі ставіць кропкі над і, то за тое, чым ты карыстаешся, трэба плаціць. Тым больш, калі грошы ёсць. Спачатку заяўлялася, што грошай няма, але потым беларуская ўлады заявілі, што гатовы расплаціцца да 5 ліпеня. Значыць, грошы былі, бо ніякага ж крэдыту не атрымлівалі. Мы бачым не вельмі інтэлігентную гульню Лукашэнкі з Расіяй. Расія, з яе гледзішча, мае рацыю, калі спрабуе выбіць гэтыя грошы.

Я не бачу ў гэтай сітуацыі палітычнага ціску на Лукашэнку. Проста Расія хоча вывесці стасункі ў энергетычным комплексе на рыначныя рэйкі. Канечне, Расія ціснe, але ціснe не так, каб выбіць у Лукашэнкі фундамент з-пад ног. У палітычным плане ніякіх зменаў гэты канфлікт не прынясе».

# Анжаліка зноў на чале Саюза палякаў

**19 чэрвеня ў Гродне прайшло пасяджэнне Рады незалежнага Саюза палякаў Беларусі.**



На ім вырашалася пытанне аб адстаўцы Анжалікі Борыс.

Кіраўнічка СПБ заявіла аб сваім намеры сысці з пасады 12 чэрвеня. Яе рашэнне было нечаканым для сяброў арганізацыі. Актывісты спадзяваліся перакапаць Борыс змяніць рашэнне. Аднак — не ўдалося. Адстаўка Борыс была прынятая Радай арганізацыі.

Выбары выканаўцы абавязкаў старшыні праходзілі на альтэрнатыўнай аснове. Абсалютную большасць галасоў набрала паплечніца Борыс Анжаліка Арэхва, якая дагэтуль адказвала ў СПБ за пытанні асветы.

«Рашэнне прапанаваць сваю кандыдатуру было складаным для мяне. Для ўсіх нас змена кіраўніка арганізацыі была вялікай нечаканасцю. Аднак я была павінна прыняць рашэнне ўдзельнічаць у выбарах. Хачу зазначыць, што СПБ надалей застанецца культурніцкай грамадскай арганізацыяй. Ніякіх зменаў не адбудзецца. Мы будзем старацца атрымаць легальны статус у Беларусі», — адзначыла Анжаліка Арэхва ў размове з карэспандэнтам «НН».

Згодна са Статутам Саюза палякаў, А.Арэхва будзе займаць пасаду в.а. старшыні на працягу двух з паловай гадоў, да наступных выбараў кіраўніка арганізацыі.

На сходзе Рады таксама было прынятае рашэнне надаць Анжаліцы Борыс статус ганаровага сябра арганізацыі і звярнуцца да ўладаў Польшчы з прапановай узнагародзіць яе за заслугі перад Саюзам палякаў Беларусі.

**Алесь Пілецкі**

## Сцісла

• **Рыхтуецца візіт Лукашэнкі ў Інданезію і Малайзію.** Падрыхтоўкай візіту займалася дэлегацыя на чале з намеснікам міністра замежных спраў Сяргеем Алейнікам. У дэлегацыю таксама ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства прамысловасці, прадпрыемстваў «БелАЗ», «Белшына», «МТЗ», Беларускай калійнай кампаніі, авіяцыйнага рамонтнага завода.

• **«Я разлічваю перамагчы Лукашэнку,** і гэта будзе не праз выбары, бо выбараў у нас няма», — заявіў прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта Андрэй Саннікаў 21 чэрвеня ў расійскай сталіцы ў інтэрв'ю радыёстанцыі «Эхо Москвы» і тэлеканалу RTVi.

• **Захар Навумаў працуе ў службе дзяржпратакола МЗС.** Да нядаўняга часу сын былога міністра ўнутраных справаў быў супрацоўнікам прадстаўніцтва Беларусі пры аддзяленні ААН у Жэневе.

• **Беларусь адмовілася выдаць Бакіева.** «Запыт кіргізскага боку аб выдачы Бакіева пакінуты без задавальнення», — сказаў афіцыйны прадстаўнік Генпракуратуры Пётр Кісялёў. Ён адмовіўся растлумачыць прычыны такога рашэння.

**ЗП**

# Альтэрнатыўны ўрад заслухаў прэзідэнтаў

**У Мінску прайшло пасяджэнне аргкамітэта па стварэнні Альтэрнатыўнага ўрада для будучага адзінага кандыдата ад апазіцыі.**

Ініцыятарам ідэі выступіў аргкамітэт партыі БХД. Таму пасяджэнне адкрывалі Павал Севярынец і Віталь Рымашэўскі. Абодва ў чорных гарнітурах, абодва без гальштукаў.

З патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты прысутнічалі Някляеў (падсеў да Раманчука), Ярашук (сядзеў побач з Калякіным), Казулін (сядзеў каля Марачкіна). Зрэшты, гэтых прэтэндэнтаў так шмат, што тут адпавядае сказаць: «ды іншыя». Нікога не было з лідэраў Руху «За Свабоду».

Ад «Хартыі'97» прысутнічаў Зміцер Бандарэнка, але дэманстратыўна сышоў у часе выступу Рымашэўскага. «Чаго ты ідзеш туды? Там табе слабую пасаду выдзелілі — міністра культуры», — спрабаваў ён запыніць Уладзіміра Някляева, але той не паслухаўся.

Першым узяў мікрафон палітычны аналітык Валер Карбалевіч. Ён выказаў скепсіс адносна ідэі альтэрнатыўнага ўрада ў сітуацыі, калі ў апазіцыі няма адзінства. «Упершыню ніхто з апазіцыйных кандыдатаў не ставіць сабе задачу перамогі на выбарах, — наракаў ён. — Апазіцыя перападвараецца ў кола дысідэнтаў».

«Можа быць, гэта ў нейкай ступені гульнявая тэхналогія», — прызнаўся Севярынец.

БХД нарадзіла гэтую ідэю як своеасаблівую дэкларацыю пра намеры і перадае гэтую ідэю шырокай грамадскасці.

А вось праваабаронца Алег Воўчак запрапанаваў: «Я на дзяржслужбу хачу вярнуцца. І хачу вярнуцца на канкрэтную пасаду — Генеральнага пракурора». Супрацоўнікаў пракуратуры цікавіць не кандыдатура, а праграма. Следчы камітэт будзе пры міліцыі ці пры пракуратуры. Прызначаць генпракурора будзе прэзідэнт ці парламент.

Аляксандр Ярашук выступаў па-беларуску. «Ідзе ператварэнне апазіцыі ў новы якасны стан, — запэўніў ён. — Ёсць новыя твары, плыні і ідэі». І нагаварыў шмат кампліментаў лідэрам БХД.

Уладзімір Някляеў таксама арганізатараў пахваліў, палітаратурнаму. За тое, што яны фабулу, «жыццёвую муць», як казаў Шклоўскі, ператвараюць у сюжэт — які пачынаецца з перамогі. «А перамогу адкладваць ужо няма куды», — скончыў ён.

Сяргей Калякін зрабіў здаровую заўвагу: «Кааліцыйны ўрад магчымы толькі ў тым выпадку, калі мы дамовімся пра кааліцыйнага кандыдата ў прэзідэнты». Казулін прамаўчаў.

З 14 чалавек, якія заявілі аб намеры вылучацца ў прэзідэнты, на пасяджэнне па стварэнні альтэрнатыўнага ўрада з'явіліся дзевяць.

Пасяджэнне было абвешчанае закрытым. Кандыдатаў запрасілі застацца на круглы стол па выбарах працэдуры вылучэння адзінага кандыдата.

**Мікола Бугай**

# Дзяржава для народа, а гатэлі для сябе

**Многія элітныя гасцініцы Мінска належаць Кіраўніцтву справаў прэзідэнта.**

Да 2014 года ў сталіцы паўстане шэсць новых чатырох- і пяцізоркавых гатэляў. У іх ліку элітныя Radisson Olympic, Hyatt Regency... Найбуйнейшыя міжнародныя карпарацыі гатовыя прыйсці на беларускі рынак паслуг. Але з кім яны будуць канкураваць? З гатэлямі Самога.

### Абы-каму гатэлі не аддадуць

Па падліках, у Беларусі працуе 297 гатэляў і гатэльных комплексаў. З іх муніцыпальнымі з'яўляецца амаль палова — 130 збудаванняў, пераважна ў райцэнтрах. Але насамрэч доля дзяржавы нашмат большая. Свае ведамасныя гатэлі мае большасць міністэрстваў. Пэўная доля належыць і ўласна Адміністрацыі прэзідэнта.

Напрыклад, супердарагі гатэль «Мінск» на плошчы Незалежнасці належыць менавіта Кіраўніцтву справаў прэзідэнта.

У Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі існуе план прыватызацыі камунальных гатэляў. Але праграма датычыцца выключна рэгіёнаў. Мінскія гатэлі не прадаюцца. Да ліку камунальных у сталіцы адносяцца толькі прыбытковыя элітныя «Еўропа» і «Вікторыя».

### Найлепшыя зорныя гатэлі

«Зорнасць» гатэляў у нашай краіне рэгулюецца ДАСТам, агульным для ўсіх краін СНД. Ён адрозніваецца ад міжнародных параметраў колькасцю паслуг для VIP-кліентаў. Напрыклад, амерыканцы і еўрапейцы перакананыя, што 5*-я гатэлі мусяць мець басейны і верталётныя пляцоўкі. Беларусі такое і не снілася.

Пяцізоркавых гатэляў у Беларусі ўсяго два. Гэта мінскія **«Еўропа»** і **Crowne Plaza** («Краун Плаза»).

Як ужо зазначалася раней, «Еўропа» знаходзіцца ў муніцыпальнай уласнасці. Адкрыты пасля рэканструкцыі ў 2007 годзе, гатэль адразу ж выйшаў на самаакупнасць. Яшчэ б! Самы просценькі аднамясцовы нумар каштуе 265 еўра за ноч. А вось за прэзідэнцкі люкс трэба заплаціць як мінімум 1105 еўра.

Crowne Plaza — адзін з нешматлікіх гатэляў, што належаць замежнікам. Яго ўладальнік — турак Судзі Азкан. «НН» пісала пра яго як уласніка элітнага казіно, у якім кожны наведнік траціць як мінімум тысячу даляраў, і ягоную жонку-беларуску. Бізнэсовец узначальвае сусветную карпарацыю Princess International Group. Мінскае будаўніцтва каштавала яму $34 мільёны. Гатэль адчыніў свае дзверы ў 2008 годзе. Самы танны нумар каштуе 204 еўра за ноч.

Сертыфікат чатырохзоркавых гатэляў у краіне маюць мінскія **«Вікторыя»**, **«Мінск»** і віцебская **«Лучоса»**.

«Лучоса» — найлепшы гатэльны комплекс за межамі сталіцы. Яго пабудавалі віцебскія ўлады ў 2004 годзе, перадусім для гасцей «Славянскага базара».

Муніцыпальная «Вікторыя» адкрылася ў Мінску ў 2007 годзе. Яна хоць і належыць сталічным уладам, але цесна звязаная з Расіяй. Піцерскія бізнэсоўцы маюць там памяшканні пад казіно. За мінулы год чысты прыбытак гатэля склаў $1,75 мільёна. Пры гэтым яго можна лічыць бюджэтным у параўнанні з астатнімі. Кошт нумароў пачынаецца «ўсяго» са 135 еўра.

«Мінск», якім валодае Ўпраўленне справамі прэзідэнта Беларусі, летась зарабіў больш — $2,5 мільёна. Нумары каштуюць ад 145 еўра. Пасля рэканструкцыі ён адкрыўся ў 2002 годзе.

### Серадនякі

Геаграфія шаснаццаці трохзоркавых гатэляў шырэйшая. Яны прадстаўленыя ў кожнай з абласцей. Больш за ўсё, зразумела, у Мінску. Але прыватных сярод іх вобмаль. Адзін з такіх, сціплы, мае Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр (IBB).

Кіраўніцтва справаў прэзідэнта валодае адразу двума — **«Планетай»** і **«Юбілейным»**. **«Сілічы»** і тры гатэлі Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» належаць дзяржаве, а **«Нафтан»** — аднайменнаму наваполацкаму прадпрыемству.

Жлобінская **«Славінаспорт»** належыць замежнаму прадпрыемству «Юнівест-М», якое займаецца пастаўкамі і перапрацоўкай нафты. Таксама кампанія мае інтарэсы на рынку нерухомасці Беларусі.

Лідскі **«Кантынент»** мае ва ўласнасці кампанія «Ліпласт-СПБ» на чале з мясцовым бізнэсоўцам Ігарам Рышкевічам. Прадпрыемства займаецца выпускам вырабаў з шклапластыка. Праўда, кажуць, што грошы на гатэль выдзеліў не ён, а ягоны брат, уладальнік лакафарбавага завода ў Пецярбургу.

Па ўзроўні камфорту да трохзоркавых гатэляў адносяць і гродзенскі «Сямашка». Ім валодае нядаўна пастаўлены старшыня праўладнага Саюза палякаў Станіслаў Сямашка. Але ягоная гасцініца пакуль што не прайшла сертыфікацыі.

### Перспектыўныя праекты

Канкрэтныя планы па будаўніцтве элітных гатэляў маюцца адразу ў некалькіх інвестараў. Найбольшы розгалас набыў праект сусветнай карпарацыі **Kempinski**. Грамадская думка ўсё ж «вынесла» будынак з Кастрычніцкай плошчы ў раён цырка. Найбольшы пакет акцый кампаніі належыць Бюро нерухомасці Тайланда.

**Hyatt Regency** павінен быў з'явіцца ў раёне вуліцы Нававіленскай у Мінску ўжо летась. Амерыканская карпарацыя Global Hyatt Corporation мае гатэлі ў 45 краінах свету. На чале арганізацыі стаіць сям'я чыкагскіх мільярдэраў Прыцкераў.

У наступным годзе ў Беларусь прыйдзе і яшчэ адна амерыканская сетка, **Radisson**. Грошы на гэты гатэль, тым не менш, дае расійскі інвестар. Кампанія гатовая пабудаваць у дадатак да гасцініцы яшчэ і штаб-кватэру Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

Пасля рэканструкцыі стане пяцізоркавай і гасцініца «Кастрычніцкая». Яна зменіць назву на салідную **«Прэзідэнт-гатэль»**. Назва адпавядае ўладальніку. Гатэль месціцца ў суседнім будынку з Адміністрацыяй прэзідэнта і належыць Кіраўніцтву справаў прэзідэнта Беларусі.

**Яўген Васількоў**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Прэзідэнцкі нумар у «Краун Плазе».**



**Уладальнік «Краун Плазы» турак Судзі Азкан.**



**Да мінскіх гатэляў прыплывуць яхты. На здымку — праект Hyatt Мінск.**

## Заробак бюджэтнікаў узрасце задняй датай

**Тарыфная стаўка ўсё роўна меншая за дакрызісныя часы.**

16 чэрвеня ўрад прыняў рашэнне павялічыць тарыфную стаўку першага разрада з 81 000 да 90 000 рублёў. Пастанова прынятая задняй датай — з 1 чэрвеня. І ўсё роўна гэта будзе адхіленне ад графіка.

У пачатку года ўлады паабяцалі бюджэтнікам, што стаўка паднімецца тройчы — у красавіку, верасні і лістападзе. З мэтай, каб да канца года давесці сярэдні заробак у краіне да $500, а ў бюджэтнікаў хаця б да $400.

Нагадаем, што папярэдняе павышэнне стаўкі адбылося паўгода таму — 1 студзеня. А вось максімальнай велічыні яна дасягала перад крызісам, калі ў канцы 2008 года стаўка складала 91 тысячу рублёў.

**ЯВ**

## Кітайская спакуса памерам $15 мільярдаў

**Кітай прапанаваў Беларусі чарговы крэдыт.**

«Па дамоўленасці на ўзроўні кіраўнікоў дзвюх краін сёння разглядаецца пытанне рэалізацыі больш за $15 мільярдаў крэдыту, які дасць Кітай, у тым ліку $1 мільярд — на льготных умовах», — сказаў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянон Ломаць, удакладніўшы, што рашэнне аб пераліку інвестыцыйных праектаў пад гэтыя крэдыты плануецца прыняць у бліжэйшы час.

У той жа час, па яго словах, на разглядзе ва ўрадзе Беларусі знаходзіцца больш за 100 інвестпраектаў. І ў кітайскіх бізнесменаў ёсць магчымасць паўдзельнічаць у іх.

Варта адзначыць, што Кітай дае крэдыты на вельмі жорсткіх умовах, якія прывязваюць эканоміку краіны, якую крэдытуюць, да кітайскай прадукцыі. Таму ўсе ранейшыя дамоўленасці з Кітаем не спрацоўвалі. Напрыклад, дамова «своп», якая мела перавесці двухбаковы гандаль на рублі і юані, не мела практычнай карысці менавіта з гэтых прычын.

**МБ**

## Закруцілі газ, а пацякло малако

**Расіян зноў «не задавальняе якасць» беларускай прадукцыі.**

З 25 чэрвеня Россельгаснагляд уводзіць часовыя абмежаванні на пастаўкі малочнай прадукцыі з чатырох беларускіх прадпрыемстваў.

Спіс прадпрыемстваў, прадукцыя якіх забараняецца для ўвозу ў Расію, уключае ў сябе Барысаўскі малочны камбінат, Асіповіцкі малочны камбінат, Бярозаўскі сыраробны камбінат і «Бабулін гладыш». Забарона ўводзіцца ў сувязі з «неаднаразовым выяўленнем антыбіётыкаў тэтрацыклінавай групы ў прадукцыі».

Папярэдні раз канфлікт, звязаны з малочнай прамысловасцю, узнікаў летась, таксама ў чэрвені. Тады Расія забараніла ўвоз беларускай малочнай прадукцыі, спаслаўшыся на неадпаведнасць яе новаму тэхнічнаму рэгламенту.

**ЯВ**

## Сцісла

• **У Мінску налічылі 30 тысяч «пустых» кватэр.** Апроч таго, паводле падлікаў «Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі», у сталіцы налічваецца 2211 індывідуальных прыватных дамоў, плошча якіх перавышае 200 квадратных метраў. Нагадаем, што з 1 чэрвеня плата за паслугі ЖКГ у такіх дамах і кватэрах вырасла ў 2—2,5 разу.

• **Тэмпы росту замежнага доўгу Беларусі запаволіліся.** Валавы замежны доўг Беларусі на 1 красавіка 2010 года дасягнуў $22,2 мільярда. З пачатку года ён павялічыўся на $183 мільёны. Летась доўг рос нашмат хутчэй і агулам за кошт дапамогі МВФ і Расіі павялічыўся амаль на $7 мільярдаў. Пры гэтым з пачатку года паменшаў замежны доўг органаў дзяржаўнага кіравання і запазычанасць камерцыйных банкаў.

• **Эстонія пераходзіць на еўра.** Эстонія стане першай з прыбалтыйскіх краін, якая пяройдзе з нацыянальнай валюты — кроны — да еўра. Адпаведнае рашэнне прынялі кіраўнікі краін ЕС. Пераход мае адбыцца 1 студзеня 2011 года.

• **Украіна прызнала $134 мільёны доўгу перад Беларуссю.** «Цяпер трэба шукаць механізм вырашэння гэтага пытання», — заявіў амбасадар Украіны Раман Бяссмертны.

**ЯВ**

Для нас няма нічога незвычайнага ў тым, каб пагуляць у футбол ці выехаць на прыроду з сябрамі, а для некаторых гэта — адзіная магчымасць выйсці за сцены свайго інтэрната. Як для ўдзельнікаў турніра па міні-футболу SeniCup-2010 сярод дамоў-інтэрнатаў для людзей з псіхічнымі захворваннямі. Турнір адбыўся на спартыўнай базе пад Вілейкай.

# Футбол за сценамі інтэрнатаў



НАСТАССЯ ШАМРЭЙ

Першая думка была дзіўная: «штосьці няправільна». Звычайныя мужчыны і жанчыны гуляюць у звычайны міні-футбол. Усмешкі, радасць сустрэчаў і дзясяткі добрых твараў.

Аднак пры знаёмстве становіцца зразумела, што гэтыя людзі не падобныя да большасці. Непасрэдная шчырасць і нібы дзіцячая сарамлівасць падказваюць нам, што праз усё жыццё яны не толькі не прызвычаіліся да кантактаў з прэсай, але і ўвогуле маюць мала знаёмстваў за межамі інтэрнатаў. Мы падыходзім знаёміцца з камандай Барысаўскага дома-інтэрната, адзін з цудоўных футбалістаў Саша глядзіць на нашы простыя пытанні з непаразуменнем:

**«НН»: Даўно вы ўжо ў інтэрнаце?**

**Саша:** Вельмі даўно.

**«НН»: А чаму вы там жывяце?**

**Саша:** Такі мой лёс.

**«НН»: Вы часта маеце магчымасць выехаць за межы дома-інтэрната?**

**Саша:** Як Бог дасць.

Стаўленне да Бога ў выхаванцаў дамоў-інтэрнатаў неверагоднае. Многія нашы суразмоўцы настолькі шчыра і светла вераць у Бога, што мне сорамна за сваю занадта моцную веру ў людзей. Магчыма, такую рэлігійнасць можна патлумачыць тым, што звонку найчасцей выхаванцаў дамоў-інтэрнатаў наведваюць святары. Аднак ёсць і іншы аспект: толькі Бог і цуд могуць даць ім магчымасць палепшыць сваё здароўе і калі-небудзь выйсці «на волю».

«Хочацца ствараць: працаваць і сям'ю завесці», — марыць Аляксей з каманды Стаўбцоўскага дома-інтэрната. Ён у інтэрнаце ўжо восем гадоў, да таго працаваў ахоўнікам у рэстарацыі ў Лагойску.

На пытанне, ці гатовы выйсці і жыць далей у грамадстве, Аляксей адказвае: «Ад мяне нічога не залежыць. Паколькі я недзеяздольны, я не магу сам нічога дабіцца. Калі хтосьці зацікаўлены, каб я выйшаў, то ўсё ўдасца».

Гэтых людзей лічаць «іншымі». Яны доўгія гады (а некаторыя — усё жыццё) праводзяць без сям'і, за сценамі спецыяльных інтэрнатаў. Грамадства ставіцца да людзей з псіхічнымі разладамі насцярожана, з бояззю ці проста абыякава. Імкненне адмежавацца ад людзей «з праблемамі» пераважае. Але тыя з іх, якія пакутуюць на лёгкую і сярэднюю ступені псіхічных разладаў, могуць знайсці сваё месца ў соцыуме і адбыцца як нядрэнныя спецыялісты ў многіх галінах чалавечай дзейнасці — калі грамадства будзе гатовае даць ім шанец.

«Для людзей сёння свята. Яны абдзеленыя пяшчотаю. Вось сёння тут выступаюць поп-зоркі. Яны будуць потым хадзіць год і расказваць, што бачылі Дарафееву, Афанасьеву... А ім не будуць верыць. І яны будуць паказваць фотаздымкі і аўтографы. І гэта цэлае жыццё. Хочацца нешта добрае прынесці гэтым людзям, яны заслугоўваюць гэтага», — кажа Сяргей Гарбуноў, адзін з арганізатараў турніру, прадстаўнік кампаніі TZMO.

Каманды выхаванцаў беларускіх дамоў-інтэрнатаў змагаліся за права выйсці ў наступны раўнд спаборніцтваў, якія пройдуць у Польшчы. Можна толькі ўявіць, што для гэтых людзей значыць паездка за мяжу. Нават гэтае мясцовае спаборніцтва стала для іх падзеяй года. Гэтыя людзі пакутуюць на лёгкую і сярэднюю ступені псіхічных разладаў мозгу. Футбольны чэмпіянат для іх — вялікае свята, магчымасць знайсці новых сяброў, адчуць сябе паўнавартаснай часткай грамадства.

**Настасся Шамрэй**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# «Мы верныя свайму Прэзідэнту»

Каб абараніцца ад крымінальнай справы, кіраўніцтва шклозавода «Нёман» арганізавала зварот да Лукашэнкі.

«У Бярозаўцы кіраўніцтва горада і шклозавода «Нёман» арганізавала зварот да Лукашэнкі. «Збіраюць» подпісы ў працоўных завода», — напісаў у «НН» Сяргей Трафімчык з Бярозаўкі, што ў Лідскім раёне. Ён выказвае здагадку, што зварот да Лукашэнкі мае на мэце вымаліць літасці для дырэктара завода, на якога завялі крымінальную справу.

Зварот пачынаецца з падзякі на імя Лукашэнкі за падтрымку шклозавода «Нёман», які для жыхароў мястэчка — «адзіная крыніца жыцця» і «карміліц». Далей у лісце гаворыцца, што «з прыходам на завод новага кіраўніка — дырэктара Бацяна Ігара Міхайлавіча — пачаліся велізарныя перамены да лепшага». А «рэальная перспектыва для развіцця горада» з'явілася пасля наведвання горада і прадпрыемства Лукашэнкам, які ў хуткім часе па візіце падпісаў адпаведны ўказ і выдзеліў сродкі на мадэрнізацыю завода. Як вынік, напрыканцы ліста гаворыцца: «Мы верныя свайму Прэзідэнту і іншага Кіраўніка нашай дзяржавы не ўяўляем».

### «125 гадоў, і нічога не мянялася»

У прыёмнай шклозавода «Нёман» карэспандэнту «НН» не пацвердзілі факт збору подпісаў, але пры гэтым запрасілі ў госці на прадпрыемства. «Прыязджайце і пабачыце, што ўдзячнасць кіраўніцтву краіны такая вялікая, што яе немагчыма выказаць. Нашаму заводу 125 гадоў, і тут да апошняга часу нічога не мянялася — ні тэхналогіі, ні сыравіна. А ў 2005 годзе прыехаў Аляксандр Лукашэнка і пабачыў, якое ўнікальнае наша прадпрыемства. Ён аказаў нам дзяржаўную дапамогу, падпісаў указы. Цяпер мы, 4-тысячны калектыў, развіваемся, своечасова атрымліваем заробак».

### «Дырэктар завода тут чужы»

«Подпісы пад зваротам збіраюць проста на прахадной», — сказаў нам адзін з рабочых. Людзі працягваюць наракаць на заробкі і цяжкія ўмовы працы. Пра дырэктара Бацяна рабочыя кажуць без таго піетэту, якім прасякнуты зварот да Лукашэнкі. «Ён чужы тут, вараг. Працаваў у Лідзе на піўзаводзе, на «Лакафарбе».

Супрацоўнікі завода не вераць, што іх кіраўніка асудзяць. Дарэчы, новы кіраўнік вобласці Сямён Шапіра нечакана прыехаў на завод на наступны дзень пасля заступлення на пасаду. «Пахадзіў па заводзе, але з людзьмі не сустракаўся».

### Пад кантролем у Ломаца

У лістападзе 2009 г. эканамічная сітуацыя на заводзе ў Бярозаўцы стала нагодай для сумеснай нарады ў Камітэце дзяржкантролю. Старшыня КДК Зянон Ломаць нагадаў тады дырэктару «Нёмана», што дзяржава так і не прычакала аддачы ад пералічанай прадпрыемству дапамогі ў памеры 100 мільярдаў рублёў. А пасля заводам у Бярозаўцы заняліся МУС і пракуратура.

У маі 2010 г. на Бацяна і яго намесніцу па эканоміцы Іну Клішэвіч завялі крымінальную справу. Нягледзячы на гэта, дырэктар застаўся выконваць свае абавязкі.

Паводле некаторых звестак, следства спрабавала даказаць, што цягам 2007—2009 гадоў Бацян і Клішэвіч нанеслі прадпрыемству шкоду на суму каля 73 мільярдаў рублёў. Цікавы момант: 8 чэрвеня 2010 г. Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, згодна якога «Белаграпрамбанку» прапануецца выдзеліць заводу крэдыт у 23,6 млн еўра, што прыблізна складае памер нанесенай шкоды. Яшчэ адзін крэдыт дадуць у беларускіх рублях — 17,6 млрд бел. руб.

**Сямён Печанко**

## Здарэнні сцісла

• **Жудаснае ДТЗ на МКАД: загінулі шэсць чалавек.** 20 чэрвеня каля 21-й гадзіны кіроўца на аўтамабілі «Фіят Брава» на кальцавой у раёне Курасоўшчыны не даў рады кіраванню, вылецеў з праезнай часткі і ўрэзаўся ў асвятляльную мачту. Аўтамабіль разарвала. Кіроўца і пасажыры — два хлопцы і чатыры дзяўчыны — загінулі. Іх узрост — 19—21 год.

• **У Шчучынскім раёне забіўся на матацыкле 15-гадовы.** Не маючы правоў, падлетак лётаў на матацыкле «Усход» ноччу па вёсцы Бераставіца. Не справіўся з кіраваннем і ўрэзаўся ў плот. Хлопец загінуў.

• **Польская мытня затрымала найбольшую ў гісторыі партыю цыгарэт з Беларусі.** У грузавіку было знойдзена 600 тысяч пачкаў, ці 12 млн цыгарэтаў з расійскімі акцызнымі знакамі. Груз ацэньваецца на 1,4 млн долараў. 40-гадовы кіроўца з Беларусі кажа, што не ведаў, што вёз.

• **У Ваўкавыскім раёне забілі ягадніцу.** Раней судзімы за крадзеж 21-гадовы жыхар Ваўкавыскага раёна падазраецца ў тым, што забіў у лесе 23-гадовую дзяўчыну, якая збірала ягады. Яе труп ён утапіў у рацэ Рось. Падазраваны цяпер хаваецца ва Украіне.

• **Дырэктара падазраюць у крадзяжы 135 млн рублёў.** Пачатая крымінальная справа ў дачыненні да дырэктара аднаго з адкрытых акцыянерных таварыстваў Лепельшчыны. 39-гадовы дырэктар падазраецца ў крадзяжы, які здзейсніў у верасні 2009-га — чэрвені 2010 гадоў.

• **Міліцыянт-браканьер трапіў у СІЗА.** Работнікі Бярозаўскай міжрайінспекцыі паблізу вёскі Лявошкі Бярозаўскага раёна спынілі для праверкі аўтамабіль «Мерсэдэс-123», якім кіраваў работнік Бярозаўскага РАУС. У машыне было 174 кілаграмы карпаў і таўсталобікаў і мокрыя сеткі. Рыба вернутая ў рыбгас «Сялец». Парушальнікі змешчаныя ў СІЗА.

• **Выкладчык ВНУ затрыманы па падазрэнні за атрыманне хабару.** За добрую адзнаку на экзамене ён атрымаў ад студэнтаў 2100 даляраў.

• **У Гродне злавілі серыйнага офіснага злодзея.** Злачынец трапляў у памяшканні арганізацый і ўстаноў і краў пакінутыя без нагляду партманэ, мабільнікі. Яму інкрымінуецца 20 эпізодаў.

• **Актывізаваліся пляжныя злодзеі.** 25-гадовы жыхар Лельчыц падазраецца ў тым, што ўкраў рэчы ў чалавека, пакуль той купаўся. З кішэні шортаў прапала банкаўская картка, з якой пазней знялі мільён рублёў. У іншага плыўца на беразе Дняпра скралі 5 тысяч рублёў, мабільны тэлефон і абутак. У 19-гадовай дзяўчыны ў Гомелі на Сажы невядомы скраў адзежу, сумку і мабільнік.

**СМ; «Еўрарадыё», БелаПАН, «Звязда»**

# Тэатр імя Дыега Марадоны



Вядучыя еўрапейскія зборныя на гэтым мундыялі калоціць. А вось каманды з Паўднёвай Амерыкі радуюць сваіх заўзятараў. Бразільцы без відавочных цяжкасцяў далі рады КНДР і Кот-д'Івуару, а Аргенціна выйграла ў Нігерыі і Паўднёвай Карэі.

## Хто лепшы: Марадона ці Пеле?

Самым заўважным персанажам у матчах Аргенціны з'яўляецца іхні трэнер, харызматычны 49-гадовы Дыега Марадона. Здаецца, гэты чалавек не ўспрымае мундыялю ўсур'ёз, для яго гэта чарговая прыгода, ці нават афера, у багатым на падзеі жыцці.

У інтэрнэце нават прымаліся стаўкі, на які дзень першынства Марадона ўліпне ў першы скандал. І вялікі аргенцінец не змусіў доўга чакаць. Вядомыя футбалісты мінулага француз Плаціні і бразілец Пеле мелі неасцярожнасць не найлепшым чынам выказацца пра зборную Аргенціны і трэнерскія якасці Марадоны.

«Усе мы ведаем натуру французаў. Плаціні — француз, і ён лічыць, што лепшы за астатніх», — сказаў Марадона.

Наконт Пеле ягоныя ацэнкі былі яшчэ больш жорсткія. «Пеле даўно пара вярнуцца ў музей», — катэгарычна заявіў Дыега.

Гэта адвечная футбольная спрэчка, хто найлепшы — Пеле ці Марадона? ФІФА лічыць, што Пеле. А вось звычайныя заўзятары, што галасавалі на сайце міжнароднай федэрацыі, у сваім выбары былі адназначна на баку аргенцінца. За яго свае галасы аддалі 53% апытаных.

«Пеле — гэта марыянетка ў руках ФІФА, таму найлепшым зрабілі яго, а тым часам заўзятары галасуюць за мяне», — кажа на гэта Марадона.

## «Яго так білі, што я баюся, яго ўвогуле заб'юць»

Дыега — унікальны футбаліст. Ён удзельнічаў у чатырох чэмпіянатах свету. Толькі легендарны немец Лотар Матэус і мексіканскі галкіпер Антоніа Карбахала бралі ўдзел у пяці. Марадона мог быць суаўтарам гэтага дасягнення, але на пераможны для Аргенціны чэмпіянат 1978 года футбаліста не ўзялі праз кепскі характар.

Футбаліст тэлефанаваў галоўнаму трэнеру і ўпрошваў узяць яго на мундыяль, але Сесар Меноці быў бязлітасны да маладога таленту. «Гэта была самая вялікая параза ў маім жыцці», — кажа кумір мільёнаў.

Марадона выйшаў з найбяднейшых кварталаў Буэнас-Айрэса. Малы Дыега быў вымушаны ляпіць і прадаваць гліняныя збаночкі, каб неяк дапамагчы сям'і. Сёння ў яго застаюцца надзвычай кранальныя адносіны з маці. «Калі яна папросіць Месяц, то я зраблю ўсё, каб яго дастаць. Але гэта будзе дробязь у параўнанні з тым, што яна зрабіла для мяне». Марадона не любіць узгадваць свайго маленства, нават стараецца не наведваць квартал, дзе прайшлі ягоныя маладыя гады.

Дэбютным першынствам для Марадоны быў мундыяль 1982 года ў Іспаніі. Футбаліст яго скончыў выдаленнем у матчы з Бразіліяй, у Марадоны проста не вытрымалі нервы. «Яго так білі, што я баяўся, яго ўвогуле заб'юць», — казаў потым слынны савецкі варатар Рынат Дасаеў.

## Рука Бога

Новы трэнер «нябесна-белых» Карлас Біларда пачаткова хацеў адмовіцца ад паслуг гульца з крутым норавам, але пабачыў, што без яго выбудаваць баяздольную зборную не ўдасца. Біларда прыняў складанае рашэнне будаваць каманду вакол асобы Марадоны, за што яго крытыкаваў нават першы дэмакратычна абраны прэзідэнт краіны Рауль Альфансіна.

У 1985 годзе Дыега пасля трох гадоў прастою зноў надзеў майку зборнай. А на чэмпіянаце свету-1986 адбыўся сапраўдны бенефіс Марадоны.

У чвэрцьфінале Аргенціна сышлася з Англіяй. За чатыры гады да гэтага краіны ваявалі за Фалклендскія выспы. Таму матч быў прынцыповы для ўсіх. На трыбунах нават адбыліся сутычкі.

У будучыні гэтую сустрэчу будуць найчасцей узгадваць з усіх праведзеных на мундыялях. Справа ў тым, што на 51-й хвіліне малы Марадона пераскакаў брамніка англічан Пітэра Шылтана, які вышэйшы за яго на 20 сантыметраў, і накіраваў мяч у вароты рукой. Арбітр не заўважыў таго моманту і залічыў гол. Пасля гульні Марадона сказаў славутую фразу: «Я не дакранаўся да мяча. Гэта была рука Бога».

Той гол, які і атрымаў назву «Рука Бога», быў прызнаны найлепшым у XX стагоддзі. А тое першынство засталося за Аргенцінай, Марадона быў прызнаны найлепшым гульцом турніру.

## Нарказалежнасць і лекаванне

Спартовую кар'еру геніяльнага гульца скараціла наркатычная залежнасць. На чэмпіянаце 1994 года ён трапіўся на ўжыванні наркотыкаў і быў дыскваліфікаваны на 15 месяцаў. А яшчэ за тры гады да гэтага ў яго быў суд за захоўванне какаіну.

Усё тым жа летам 1994-га футбаліст адкрыў стральбу з пнеўматычнай зброі ў журналістаў, якія хацелі ўзяць у яго інтэрв'ю, за што потым атрымаў два гады і дзесяць месяцаў турмы ўмоўна.

У 2000 годзе ў футбаліста падчас вечарынкі ў кампаніі наркабаронаў ва ўругвайскім гарадку Пунтэ-дэль-Эстэ здарыўся сардэчны крыз. Яго зноў спрабавалі прыцягнуць да суда за наркотыкі, але не ўдалося.

Пасля ўсяго гэтага Марадона з'ехаў на Кубу да свайго даўняга сябра Фідэля Кастра, каб у адной з закрытых клінік правесці курс рэабілітацыі.

## «У тунэлі я пабачыў балельшчыкаў «Рывер Плейт»

У 2004 годзе футбаліст зноў ходзіць на мяжы жыцця і смерці. У Марадоны праз залішнюю вагу і нарказалежнасць здараецца сардэчны прыступ. «Я помню ў адным фільме, калі чалавек памірае, то ён апынаецца ў тунэлі, але там пачынае пратэставаць, што ягоны час яшчэ не прыйшоў. У такім самым тунэлі пабываў і я. Там я пабачыў балельшчыкаў «Рывер Плейт», «Сан-Ларэнса», «Расінга», «Уракана», «Індэпенд'ентэ...»

Яго доўга адмаўляліся пускаць на Кубу на лячэнне. А калі дазволілі, то ён спазніўся на самалёт, пасля чаго зладзіў пагром у аэрапорце Рыа-дэ-Жанейра. На час лекавання ягоная вага складала 120 кілаграмаў.

У 2007 годзе Марадону зноў двойчы «хавалі», пасля паведамлення пра аўтакатастрофу і алкагольнае атручванне, але ён выжыў насуперак усім. Хоць і нажыў цыроз пячонкі.

## На руцэ Чэ Гевара, на назе — Кастра

Марадона развёўся з жонкай, з якой пражыў больш за 25 гадоў. «Усё чалавецтва зайздросціла Марадону, а ён зайздросціў усяму чалавецтву. Усе хацелі жыць, як Марадона, а ён хацеў жыць, як усе. Жыццё Марадоны — гэта яго вялізная драма», — кажа калега па зборнай Хорхе Вальдана.

Ці не ўсё жыццё гэты чалавек адчуваў сябе няшчасным. Наркотыкі Марадона прымаў не для таго, каб палепшыць свой стан, гэта не было допінгам. Такім чынам ён спрабаваў прыглушыць сваю дэпрэсію.

Дыега мае левыя палітычныя погляды. У яго тату з выявай Чэ Гевары на правай руцэ, а на назе — Фідэля Кастра. «Я веру ў Чавеса. Можаце называць мяне «чавістам». Усё, што робяць Чавес і Кастра, — гэта лепшае, што толькі здольныя зрабіць сучасныя палітыкі. Я ненавіджу ўсё, што звязана з ЗША. Я ненавіджу ЗША ад усёй душы», — прызнаўся аднойчы футбаліст. Ён бы мог пасябраваць і з Лукашэнкам.

Марадона з'яўляецца скандалістам ва ўсім. Ён не прызнаваў бацькоўства сваіх пазашлюбных дзяцей, а таксама не плаціць аліментаў. Разбіў шклянку вады аб галаву каралевы прыгажосці Палінезіі, калі тая пачала спрачацца з ягонай дачкой. Яго называлі гомасексуалістам.

## Дазволіў сэкс і цыгарэты

Напрыканцы 2008 года Дыега прапанавалі ўзначаліць зборную Аргенціны. І хто б сумняваўся, што Марадона адразу пагадзіўся. Ён здзіўляў нелагічнасцю сваіх учынкаў. Нацыянальная каманда пры ім пацярпела разгромнае паражэнне ад Балівіі 1:6, але вялікі гулец працягваў гнуць сваю лінію.

На чале зборнай Марадона правёў больш за 20 матчаў і ні разу не згуляў унічыю. Ён прызнае толькі перамогі альбо паражэнні. Ніякіх сярэдніх варыянтаў.

На афрыканскім першынстве ён шакаваў усіх, калі дазволіў сваім футбалістам піць, паліць, а таксама займацца сэксам перад гульнямі. Але варта пабачыць, з якой пяшчотай і любоўю абдымае гульцоў Аргенціны пасля замены. Футбалісты адказваюць яму той жа пашанай.

## «Футболка нумар 10: паміж раем і пеклам»

Калі глядзіш на гэтага чалавека, то не адразу верыш, што ў свой час ён быў футбольным Богам. Марадона мае ўсяго 167 сантыметраў росту, асаблівай стройнасцю ён таксама ніколі не вылучаўся.

Але ягоная тэхніка была ўнікальнай. Марадона першым пачаў выкарыстоўваць такія прыёмы, як перакідванне, катанне мяча на высокай хуткасці. Ён валодаў цудоўным бачаннем поля, а таксама надзвычайнай трываласцю.

Жыццё Марадоны — гэта вялізная тэатральная пастаноўка, за якой не стамляешся сачыць. На Кубе нават была пастаўленая адмысловая п'еса «Футболка нумар 10: паміж раем і пеклам».

У 2008 годзе сербскі рэжысёр Эмір Кустурыца зняў біяграфічны фільм пра Марадону. Значная частка яго была прысвечаная «Царкве марадоніяны», заснаванай яшчэ ў 1988 годзе.

Падчас гульняў зборнай Аргенціны часам ловіш сябе на думцы, што назіраць за паводзінамі Марадоны на трэнерскім мосціку куды цікавей, чым сачыць за гульнёй футбалістаў.

Застаецца толькі шкадаваць, што ў жніўні 2008-га «блакітна-белых» у Мінск прывозіў не Марадона.

**Зміцер Панкавец**

## Сцісла

• **Заўзятары КНДР апынуліся фальшыўкай.** Здзіўленнем для многіх было пабачыць на матчы КНДР—Бразілія балельшчыкаў першых. Потым высветлілася, што гэта Спорткамітэт КНДР наняў каля сотні кітайскіх акцёраў, якія павінны хварэць за КНДР. Матч з Партугаліяй, дарэчы, стаў першым, які тэлебачанне КНДР паказвала ў жывым эфіры. Азіятаў бязлітасна білі — 0:7. Пасля такога пройгрышу футбалістаў у Пхеньяне дакладна не пагладзяць па галаве.

• **Анэлька абразіў Дамэнэка.** Зборная Францыі пасля паразы ад Мексікі (0:2) амаль страціла шанцы на выхад з групы. Трэнер французаў Раймон Дамэнэк раскрытыкаваў нападаючага Нікаля Анэлька. Форвард не вытрымаў і паслаў настаўніка па ўсім вядомым адрасе. Анэльку выключылі са складу каманды. Але футбалісты адмовіліся выйсці на трэніроўку ў знак салідарнасці з калегам.

• **Нізкая выніковасць.** У першым туры 32 зборныя змаглі закалаціць у вароты супернікаў толькі 25 галоў. Гэта рэкордна нізкая выніковасць мундыяляў.

• **Першай у плэй-оф выйшла каманда Галандыі.** А першай згубілі шанцы «львы» з Камеруна.

**ЗП**

**Паўднёва-афрыканскі тэлеканал Super Sport падвёў вынікі апытання на званне самага сэксуальнага футбаліста чэмпіянату свету. З вялізным адрывам першае месца заняў 22-гадовы абаронца зборнай Новай Зеландыі Уінстан Рыд. Другое месца дасталася мексіканцу Джавані Дас Сантасу. Трэці — івуарыец Дзідзье Драгба.**



# У Расіі пачалася партызанская вайна супраць міліцыі

У расійскім Прымор'і разгарнулася сапраўдная баявая аперацыя супраць групы юнакоў, што абвясцілі вайну міліцыі. Супраць пяці чалавек выслалі 1300 сілавікоў, бронетэхніку і верталёты. За два тыдні процістаяння прыморскія партызаны напалі на некалькі пастарункаў, забілі аднаго міліцыянта і некалькіх паранілі. Усё скончылася пасля шасцігадзіннага штурму кватэры ва Усурыйску, дзе маладых людзей заспелі аператыўнікі. Двое партызанаў загінулі, двое здаліся.

Сярод насельніцтва прыморскія «партызаны» здабылі нямала прыхільнікаў. Ім прысвяцілі адмысловы сайт, назваўшы іх «героямі». Па адной з версій, усе ўдзельнікі групы ў свой час пацярпелі ад міліцыйнай сваволі. Сваю вайну яны пачалі з ультыматуму, даслаўшы ў два райаддзелы ананімкі з патрабаваннямі спыніць «бязмежжа» міліцыянтаў, пракурораў і суддзяў. Цяпер жывых «партызанаў» дапытваюць. Іх сваякі пішуць у прэсу пра катаванні арыштаваных. У Кіраўску, адкуль выйшла большасць удзельнікаў групоўкі, прайшоў мітынг супраць мясцовай міліцыі.

Маштабная аперацыя ў Прымор'і не напалохала ахвочых пастраляць. Назаўтра пасля штурму ўсурыйскай кватэры стрэлы прагучалі ў Наўгародскай вобласці і ў Пермскім краі — загінуў міліцыянт, двое былі паранены.

А раней, вясною, групоўка анархістаў, якая называе сябе «гарадскімі партызанамі», здзейсніла пяць нападаў на ўчасткі міліцыі ў Маскве.

### Кожны трэці неадэкватны

Усплёск гвалту ў дачыненні да міліцыянтаў у розных кутках Расіі прымушае задумацца пра карані з'явы. Магчыма адгадка хаваецца ў выніках даследаванняў Дэпартамента кадравага забеспячэння МУС РФ. Згодна аналітычнага агляду Дэпартамента, летась у МУС было выяўлена больш за 520 начальнікаў з неадэкватным стылем кіравання (кожны дзясяты). Каля 2000 кіраўнікоў маюць сур'ёзныя псіхалагічныя праблемы. Дырэктар Цэнтра прававой і псіхалагічнай дапамогі ў экстрэмальных сітуацыях псіхіятр-крыміналіст Міхаіл Вінаградаў мяркуе, што сёння ў расійскай міліцыі працуе каля 30% неадэкватных супрацоўнікаў. Ён кажа пра сур'ёзную дэфармацыю асобы чалавека, які служыць у міліцыі. Гэта пачуццё ўлады над навакольнымі, укрывальніцтва калегаў, карумпаванасць, п'янства.

### Крывавыя будні

За лічбамі справаздач хаваюцца канкрэтныя выпадкі. Каб не быць галаслоўнымі, прывядзём колькі самых гучных выпадкаў.

Май 2009-га, Масква. Міліцыянт Раман Жыраў на пешаходным



пераходзе збіў насмерць цяжарную жанчыну і збег з месца здарэння.

Май 2009-га, Уладзівасток. Снайпер АМОНа Уладзімір Пракапенка з калегам забіў да смерці 35-гадовага аўтамеханіка.

Чэрвень 2009-га, Забайкалле. Шэсць міліцыянтаў схапілі чатырох жыхароў Забайкальскага раёна па падазрэнні ў крадзяжы хатняй жывёлы. Дамагаючыся прызнанняў, іх збівалі і катавалі каля тыдня, аднаго з затрыманых згвалтавалі гумовай дубінкай.

І самы гучны скандал, бо адбыўся ў сталіцы. У красавіку 2009-га ў Маскве маёр Дзяніс Еўсюкоў у нецвярозым стане па дарозе ў супермаркет застрэліў кіроўцу аўто, які яго падвозіў, параніў двух пешаходаў. У супермаркеце маёр застрэліў прадавачку, сем пакупнікоў параніў. Як высветлілася следства, у юнацтве Еўсюкоў тройчы лячыўся ў псіхіятрычнай лякарні. Пасля словаў намесніка міністра МУС РФ пра тое, што выпадак з Еўсюковым быў «адзінкавым», расійскі выпуск часопіса Esquire выдаў штодзённы каляндар наступных адзінкавых выпадкаў.

### «Не» манаполіі дзяржавы на гвалт

Расейская «Газета.ru» выказала свой погляд на трагедыю ў Прымор'і. Яны тлумачыць сімпатыі да «партызанаў» уплывам маніфеста, агучанага імі ў інтэрнэце. (У сваіх поглядах хлопцы блізкія да неабальшавікоў-лімонаўцаў.) Гэтая частка расійскага грамадства больш не прызнае абсалютную манаполію дзяржавы на гвалт. Спее зерне крывавага бунту, канстатуе выданне.

### А што беларуская міліцыя?

У Беларусі, у адрозненне ад Расіі, не страляюць. На шчасце. Аднак гэта не азначае, што ў нас усё бясхмарна. Толькі сёлета незалежная прэса пісала пра некалькі характэрных выпадкаў. Так, газета «Народная воля» ў лютым апублікавала гісторыю прараба з Мінска Паўла Леўшына, з якога супрацоўнікі Савецкага РУУС Мінска з дапамогай катаванняў выбівалі прызнанне ў крадзяжы. А зусім нядаўна газета апублікавала ліст мінчукоў Міхаіла і Святланы Аксяневічаў. Іх сына-інваліда неаднойчы абылгалі з прычыны судовых і міліцэйскіх памылак. У выніку хлопца знайшлі смяротна збітым пасля наведвання Ленінскага РУУС. У абодвух выпадках пацярпелыя не здолелі адшукаць і пакараць вінаватых. Яна наракаюць на кругавую паруку сярод міліцыянтаў, з якой яны сутыкнуліся ў часе разбіральніцтваў.

**Сямён Печанко**

# Гнілі ў акопах — пойдзем у зямлянкі?

**На першы погляд — цалкам дэжавю. Розніца, аднак, у тым, што чарговую вайну з Расіяй Лукашэнка трымае ў беспрэцэдэнтна нявыгадных умовах. Піша Аляксандр Класкоўскі.**




Летась таксама ў чэрвені грымнула малочная вайна, цяпер вось, здаецца, пятая газавая. Тады Лукашэнка падвесіў дамову аб КСАР, цяпер — Мытны саюз.

Капітуляваць зараз, умомант сплаціць запазычанасць ды пайсці ў той Мытны саюз на ўмовах Расіі азначала б для Лукашэнкі поўную страту аблічча.

Між тым, 4–5 ліпеня ў Астане — новы дэдлайн. Масква разлічвае, што там на саміце ЕўрАзЭС, сумешчаным са святкаваннем 70-годдзя Назарбаева, наравісты беларускі партнёр уздыме рукі, пагодзіцца на мытную тройку.

Відавочна, што Лукашэнка пераацаніў магчымасць згуляць на зацікаўленасці Масквы ў гладкім старце Мытнага саюза. Зацікаўленасць вялікая, аднак Расія трымаецца прынцыпу: куды ён дзенецца з падводнай лодкі!

Вось і дзеячы з Кіева падклалі свінню, адрапартаваўшы Маскве, што гатовы пампаваць газ у Еўропу ў абыход сінявокай рэспублікі. Замуравалі, дэманы!

Еўропа ж рэагуе вяла, бо Лукашэнка для яе не свой. Шанец збліжэння за кошт «Усходняга партнёрства» бяздарна змарнаваны. Дачыненні са Штатамі таксама застаюцца на пункце замярзання. Вось і крычы зараз, як той пастушок: ваўкі! ваўкі!

Эксперты схіляюцца да думкі, што Крэмль наўрад ці пачне гэтым разам поўнамаштабную аперацыю па замяшчэнні ўлады. Але за пралангацыю расійскае кіраўніцтва пастараецца выціснуць па максімуме. Колькі будзе каштаваць Беларусі чацвёрты тэрмін Лукашэнкі — застаецца толькі гадаць.

З рыторыкі айчыннага начальства вынікае поўная беспрасветнасць: гнілі ў акопах — пойдзем у зямлянкі.

# Зброя для спецназа

**Піша Уладзімір Халіп.**

Падчас крызісу куды найперш накіроўваюцца сродкі? Зразумела, на самае неабходнае. Без чаго ў цяжкі час ніяк не абысціся.

Аднак кіраўнік дзяржавы нашай і тут пайшоў сваім адметным шляхам. Беларусь збіраецца набываць найноўшыя ўзоры ўзбраення. Яно тэрмінова патрэбна шматлікім спецпадраздзяленням. Ні з кім краіна не ваюе. І пакуль што не збіраецца. Але гэткая драбяза нікога не цікавіць. Босымі і голымі застанемся, але неверагодную вінтоўку, якой ні ў кога пакуль яшчэ няма, абавязкова купім.

Палітыкі наіўныя перад выбарамі ідуць звычайна ў народ. А таварышы спрактыкаваныя спяшаюцца туды, дзе рэальная гарантыя элегантнай перамогі. І наўрад ці адкуль-небудзь яшчэ перамога тая бачыцца так выяўна, як з базы групы «А» тутэйшага КДБ.

Прэс-служба начальніка краіны патлумачыла мэты высокага візіту — там праводзілася «совещание по вопросу совершенствования работы межведомственных государственных органов системы обеспечения безопасности Беларуси». Крыху шматслоўна і заблытана, але нічога.

Сэнс не ў тым, каб кожны разумеў, што і да чаго. Час не той. Ён вымагае дзеянняў — рашучых і імклівых. Сантыменты былых гадоў апалі, нібы восеньскае лісце. І засталася толькі голая ісціна: стабільнасць — гэта найперш спецназ. А таму і карты яму ў рукі. Дакладней, найноўшую зброю.

Увесь час, дзе толькі можна, Лукашэнка падкрэслівае, што Беларусь надзвычай бедная краіна. І сапраўды, за расійскі газ няма чым заплаціць. Да такой дажыліся галечы, што нават у школьнікаў адабралі льготны праезд. Такая вось «сацыяльна арыентаваная» дзяржава. У цэнтры Мінска на вуліцы Платонава з савецкага часу гібее недабудаваная руіна — шпітальны корпус. Катастрафічна не хапае месцаў у раённых бальніцах. Калі ўзнікае неабходнасць хворае дзіця накіраваць на аперацыю, якую могуць выканаць толькі за мяжой, людзі самі збіраюць грошы. Хто што можа. Як падчас вайны. Калі надта пашчасціць, для каго-небудзь, магчыма, патрэбная сума збярэцца. А для большасці — не. Аднак дзяржава на дапамогу тым, пакінутым, не прыйдзе. У яе іншы клопат. Яна ўзбройвае спецназ.

**charter97.org**

# Ціхая прыватызацыя як сродак экспрапрыяцыі нацыянальнага багацця

**Піша Сяргей Богдан.**

Беларусь гатовая прадаць свае найважнейшыя прыбытковыя прадпрыемствы. У гэтым палягае сэнс лёсавызначальнай для краіны навіны пра дазвол на прыватызацыю «Беларуськалія» і магістральных трубаправодаў.

Непразрыстыя рашэнні аб пэўных кавалках дзяржмаёмасці — звыклая практыка для сучаснай Беларусі.

Сярод самых гучных спраў такога кшталту — цьмянае пытанне пра тое, каму ўсё-такі належыць паркінг на Нямізе, перадача па надзвычай невялікай цане зямлі ў гістарычным цэнтры Мінска невядомым аманскім дабрадзеям, бясплатная перадача зямлі пасярод Менска для пабудовы гатэля «Кемпінскі».

Гэтыя гешэфты аўтаматычна выклікалі б скандал у свабодных краінах, але ў Беларусі яны былі проста прынятыя да ведама і апазіцыяй, і грамадствам.

«Беларуськалій» — гэта не кавалак зямлі. Гэта прадпрыемства асабліва. Яно ўстойліва прыносіць краіне вялікія грошы.

Па-другое, дазваляецца прыватызаваць трубаправоды, якія давалі Беларусі неблагі інструмент для палітычнага і эканамічнага гандлю з Расеяй і Еўразаюзам.

> Кіроўная эліта дасягнула кансэнсусу наконт прыватызацыі, якая бачыцца як непазбежнасць.

Прыватызацыя ў Расеі паказала, што ва ўмовах адсутнасці дзейснага праўна-нарматыўнага рэгулявання працэсу раздзяржаўлення, слабасці прававахоўных і судовых органаў, адсутнасці празрыстай сістэмы кіравання дзяржмаёмасцю прыватызацыя ператвараецца ў рабаванне і марнаванне нацыянальнага багацця.

Беларуская кіроўная эліта дасягнула кансэнсусу наконт прыватызацыі, якая бачыцца як непазбежнасць. Бачыцца як сродак самавыратавання на выпадак, калі давядзецца адмовіцца ад часткі палітычнай улады. Калі Беларуссю нельга будзе валодаць цалкам, дык можна прысабечыць яе па кавалках.

Верхам наіўнасці будзе спадзявацца, што новы дэмакратычны і нацыяналістычны ўрад зможа адмовіцца плаціць па рахунках Лукашэнкі ці здолее перагледзець вынікі «прыватызацыі» — капіталізм такіх паводзінаў не трывае.

Сёння ў Беларусі перадумоваў для эфектыўнай прыватызацыі няма. Бяда, што вялікая частка апазіцыі прымае прыватызацыю за належнае і не спрабуе падняць грамадскасць на абарону нацыянальнага багацця.

*Меркаванні ў артыкулах на старонцы «Каментары» могуць супадаць, а могуць і не супадаць з меркаваннем Рэдакцыі.*

# Сланцавы бум

Сусветныя эксперты разыходзяцца ў меркаваннях, сланцавы газ — гэта знаходка стагоддзя ці звычайная мыльная бурбалка?

У 2009 годзе высветлілася, што найбуйнейшым вытворцам газу ў свеце сталі ЗША, лёгка абагнаўшы Расію. Як амерыканцы, якія заўсёды пакутавалі ад недахопу газу, здзейснілі гэты ўчынак? Крыніцай іх поспеху стаў сланцавы газ.

Што гэта за чароўны здабытак, дзякуючы якому адбылася рэвалюцыя на сусветным рынку?

## Новае — добра забытае старое

Сланцавыя радовішчы былі знойдзеныя ў большасці краін даўнымдаўно. Часам са сланцаў нават выраблялі газ і нафту — з пэўнымі складанасцямі і грашовымі стратамі. Па-першае, сланец — цвёрдая парода, па-другое, ён мае дрэнную звязнасць пор, а значыцца, да ствала свідравіны дацякае зусім невялікая колькасць нафты. З газам сітуацыя лепшая, але яго запасы ў сланцы мізэрныя. Таму яго здабыча была слабаакупнай, калі ўвогуле не стратнай.

Але ў апошнія некалькі год стала выкарыстоўвацца новая тэхналогія, гарызантальнага, а не вертыкальнага свідравання. Яна патрабуе дасканалай тэхнікі, але пры гэтым стала рэальным здабываць нашмат большыя аб'ёмы газу.

Тэхналогія заключаецца ў наступным. Свідруюцца дзве вертыкальныя свідравіны на глыбіню да 2 кіламетраў. У адну пад высокім ціскам запампоўваецца вада ў сумесі з хімікатамі, сланцавы пласт раздзіраецца на асобныя расколіны, і вада выціскае газ праз іншую свідравіну. Потым робяцца новыя свідравіны ў кірунку залягання пластоў, якія праводзяцца гарызантальна на глыбіні. Гэта значна танней за новую свідравіну, але кара апынаецца «падпілавана» гэтымі свідравінамі.

Нават нягледзячы на тое, што свідравіна можа «памерці» за некалькі месяцаў, яна цяпер паспявае акупляцца. Запасы ў ЗША проста агромністыя на большасці тэрыторыі краіны. Газ можна здабываць побач з непасрэдным спажыўцом, таму выдаткі выходзяць мінімальныя.

## Рэалізаваць амерыканскую мару

Еўрапейскія краіны вырашылі пайсці па амерыканскім шляху. Здабыць мільярды кубаметраў газу і, урэшце, атрымаць доўгачаканую незалежнасць ад «Газпрома». Расійскі манапаліст выказаў трывогу ў сувязі з магчымай стратай кліентаў. Сапраўды, у выніку магчымай «сланцавай» экспансіі наймацнейшую паразу атрымае менавіта расійская кампанія, якая пазбавіцца манаполіі і не зможа дыктаваць свае ўмовы купцам. Амбітныя планы па будаўніцтве шэрагу трубаправодаў могуць не апраўдаць сябе.

Францыя, Германія, Польшча... — сланцавая ідэя захапіла ўсю Еўропу. Польшча выявіла агромністыя запасы сланцавага газу ў сябе і распачала пошук інвестараў для распрацоўкі залежаў. $140 мільёнаў на пошук сланцавых радовішчаў газу ў Польшчы выдаткоўваюць канадская кампанія Talisman Energy і брытанская фірма San Leon Energy. У доўгім спісе кампаній, якія гатовыя ўкласці ў Польшчы сотні мільёнаў даляраў, — сусветныя паліўныя магнаты: амерыканскія ExxonMobil, Chevron, ConocoPhillips, Marathon Oil, нарвежская Statoil, французская Total.

Увесну вядомая кансалтынгавая кампанія Wood Mckenzie заявіла, што Польшча можа мець 1,4 трыльёна кубаметраў газу — столькі ж, колькі і Нідэрланды. Іншыя эксперты ацэньваюць польскія рэсурсы да 3 трыльёнаў кубаметраў. Гэта было б астранамічным багаццем на суму $1 трыльён. На думку геолагаў, Польшча мае найбуйнейшыя ў Еўропе радовішчы сланцу, які ўтрымлівае газ. А што Беларусь?

## Беларускі падыход

У нашай краіне першым публічна акцэнтаваў увагу на сланцавым газе кіраўнік дзяржавы. У час сёлетняга звароту да народа і парламента ён у форме маналогу «паразмаўляў» з прэм'ерам Сяргеем Сідорскім. «Мы з прэм'ер-міністрам нядаўна абмяркоўвалі пытанне пра сланцавы прыродны газ. Вы яго дасталі з Мясніковічам? Не дасталі. А нядаўна еўрапейцы заявілі, што з дапамогай сланцавага прыроднага газу на трацціну ў хуткім часе скароцяць пастаўкі газу з Расіі. Чаму мы сядзім? Калі мы можам і гэта — давайце на гэтым кірунку сканцэнтруем грашовыя сродкі. Гэта ж невялікія грошы, бо мы ўмеем свідраваць, секчы, даставаць».

Пакуль што словы застаюцца толькі словамі. Канкрэтнай праграмы распрацоўкі радовішчаў пакуль не прынята. Па словах акадэміка Радзіма Гарэцкага, раней у Беларусі разведвалі сланцы, а не сланцавы газ. Па інфармацыі РУП «Белгеалогія», залежы гаручых сланцаў выяўлены ў Прыпяцкай западзіне. Рэсурсы ацэньваюцца ў 8,8 мільярда тон. Асноўны аб'ём гаручых сланцаў засяроджаны ў Тураўскім і Любанскім радовішчах. Але ніводнае з іх не падрыхтаванае да прамысловага засваення, выканана толькі іх папярэдняя выведка.

## Вядро дзёгцю

Такая вялікая колькасць патэнцыйных плюсаў не можа не ўраўнаважвацца істотнымі мінусамі. Хоць сланцавы газ знайсці і нескладана, асноўнае пытанне — як яго дастаць? Неабходна рабіць тысячы свідравін на вялікіх пляцоўках. Гэта адна з першых перашкод для большасці густанаселеных еўрапейскіх краін. Зрэшты, беларускаму Палессю з ягонымі абшарамі гэта не пагражае. А вось патрэбных тэхналогій няма ні ў нашай краіны, ні ў палякаў. Яны ёсць толькі ў амерыканцаў.

Застаецца адкрытым і экалагічнае пытанне. Барацьбіты за захаванне прыроднай сістэмы абвінавачваюць газавыя кампаніі ў забруджванні грунтавых водаў і запасаў пітной вады.

Але галоўнае спрэчнае пытанне — цана. Па адных падліках, сабекошт атрыманага газу ва ўмовах Усходняй Еўропы будзе складаць $90—100 за тысячу кубаметраў, паводле іншых — $120—160. Ёсць і варыянты, па якіх кошт здабычы дасягае $220. Калі так, то ён аказваецца даражэйшым за прыродны газ ад «Газпрома».

Па меркаванні некаторых каментатараў, цяперашні ажыятаж вакол сланцавага газу з'яўляецца вынікам піяр-кампаніі, за якой стаяць карпарацыі, якія ўжо ўклалі ў гэтыя праекты немалыя сумы і зараз хочуць атрымаць прыток дадатковых сродкаў.

**Яўген Васількоў**




БЕЛТА



**Схема залежаў сланцавага газу ў Польшчы. Аналагічнай карты для Беларусі не існуе, але відавочна, што пласты цягнуцца і на беларускае Палессе.**

# Радзім Гарэцкі: Камісія на чале з Сідорскім разглядае мэтазгоднасць здабыцця сланцавага газу

Пра сваё бачанне перспектываў выкарыстання сланцавага газу ў Беларусі «Нашай Ніве» распавёў **геолаг, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Радзім Гарэцкі**.

**«Наша Ніва»: Дык ці ёсць сланцавы газ у Беларусі?**

**Радзім Гарэцкі:** Звычайна са сланцаў здабываюць газ, толькі гэта іншы газ, звычайны. Гэта даўно вядома. З яго робяць і газ, і нафту. У вайну нават немцы так рабілі. Але гэта зусім не тое, што сёння завецца сланцавым газам. Не тое, што пачалі рабіць амерыканцы па новых тэхналогіях.

Многа газу нам атрымаць не ўдасца, але, калі задацца мэтай, можна знайсці хоць штосьці.

**«НН»: Польскія навукоўцы склалі карту радовішчаў сланцавага газу. Знайшлі яго і ўкраінцы ў раёне Карпатаў. Выходзіць, ён павінен быць і на Брэстчыне.**

**РГ:** Гэта не зусім Карпаты, а Прыкарпацце, карпацкі прагін. Там газ, магчыма, і будзе, але ці знойдуць яго ў нас — паглядзім. У савецкі час ладзіліся падобныя даследаванні, але яны не далі канкрэтных лічбаў, толькі прыблізныя раёны размяшчэння.

**«НН»: Вы, напэўна, чулі, што ў час звароту да парламента Лукашэнка запатрабаваў шукаць у краіне сланцавы газ. Ці звярталіся прадстаўнікі профільных міністэрстваў ці Адміністрацыі прэзідэнта ў Акадэмію навук па дапамогу?**

**РГ:** Звярталіся, але з іншым пытаннем — як апрацоўваць сланцы. У выніку быў падрыхтаваны шэраг прапановаў, якія будуць разглядацца генеральнай камісіяй па мінеральных рэсурсах на чале з Сяргеем Сідорскім. Будзе вырашацца, што ўвогуле рабіць са сланцамі. Безумоўна, гэта багацце, але ці здабываць яго? Трэба палічыць — выгадна гэта ці не. Трэба ведаць залежы, іх колькасці, экалагічную сітуацыю... Як распрацаваць, куды падзець адкіды. Але галоўнае — эканамічная ацэнка. Можа, той газ прасцей купіць у Расіі за любую цану, чым у нас здабываць са сланцаў.

**«НН»: А хто ў Беларусі займаецца такімі даследаваннямі?**

**РГ:** На жаль, эканоміка мінеральнай сыравіны развітая зусім слаба. Ніхто гэтым не займаецца, няма экспертаў. Няма спецыялістаў і па горнай справе — распрацоўцы, здабычы мінеральных рэсурсаў. Геалогія ёсць, але не геолагі гэтым павінны займацца! Яны могуць разлічыць запасы, іх глыбіню, магутнасць, карысныя якасці. А вось як здабыць, як узбагаціць, колькі гэта каштуе — пытанне застаецца адкрытым.

**Запісаў ЯВ**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Гаспадар маёнтка Матусевічы

**Фермер з вёскі Мацкі на Міншчыне Уладзімір Матусевіч вырошчвае 24 віды гародніны і пры гэтым, адрозна ад навакольных калгасаў, не залежыць ад банкаўскіх крэдытаў і не просіць субсідый на пасяўную.**



Фермер Матусевіч збудаваў сабе маленькі замак.

Цэнтр гаспадаркі — вялікі трохпавярховы дом, па сутнасці — замак.

На ўездзе ў Мацкі гасцей напаўпустой вёскі вітае бел-чырвона-белая шыльда з надпісам «Маёнтак Матусевічы». У лічбах — гэта 40 гектараў зямлі.

Гэта, кажа гаспадар, спадчына наступным пакаленням Матусевічаў: «Бываючы на Захадзе, звяртаў увагу: на ферме дзесьці ў Францыі выкладзеная з цэглы дата яе заснавання. Гэта 1800-я ці нават 1700-я гады. А я бяру свой пачатак з 1988 года, з голага месца. Дарогі будаваліся з нуля, садзіў гэтыя дрэвы. Сыну ўжо будзе лягчэй, бо каб мне такое пакінулі... Тут побач мой стары дом, дзе я нарадзіўся. Пабудаваны пасля вайны. Там дзед пражыў, бацька з маці. Вось што мне засталося. Я пакіну сваім дзецям ужо штосьці большае. Нават з гледзішча сельскага ландшафту гэта ўжо будзе нешта крыху іншае. Хацелася адысці ад звыклай у нашым разуменні вёскі».

## «Я захацеў маёнтак»

Па словах спадара Матусевіча, гэта ці не адзіны ў Беларусі выпадак, калі ператвораны за савецкім часам у архаізм «маёнтак» набыў новае жыццё:

— Праз сваю форму ўласнасці часта праходжу перарэгістрацыю. Я суб’ект гаспадарання, а ў сувязі з тым, што законы ў нас увесь час змяняюцца, трэба перапісваць статут ды ўсё астатняе. І вось якраз падчас апошняга перапісвання статута я памяняў назву. З самага пачатку была фермерская гаспадарка Матусевіча, але я захацеў маёнтак. Усе дакументы, пакеты, паперы рыхтаваў на беларускай мове. Колькі давялося пахадзіць — пачынаючы ад упраўлення юстыцыі да Міністэрства юстыцыі, — таму што «нельга на беларускай мове». Чаму? Ды проста нельга, апрыёры. Але ўрэшце дамогся такой назвы. Шыльда з’явілася два гады таму, калі скончылася апошняя перарэгістрацыя. Цяпер усё афіцыйна, у мяне такія дакументы — у статуце менавіта «Маёнтак Матусевічы.

## Родная зямля паклікала

Уплыў цывілізацыі ў Мацках невыпадковы. Уладзімір Матусевіч пасля заканчэння талінскай мараходкі абышоў на рэфрыжэратары ўвесь свет, наведваў самыя далёкія краіны — Аўстралію, Сінгапур, Тайвань, партовыя гарады Еўропы і Амерыкі. Пасля «дэмабілізацыі» цягам 10 гадоў узначальваў у Мінску адзін з ЖЭСаў, але родная зямля паклікала.

Цяпер у міжсезонне самастойна вывучае досвед фермерскіх гаспадарак за мяжой, летась з гэтай мэтай аб’ехаў усю Францыю. І засмучаны, што ў свядомасці беларусаў так моцна ўбітая калектыўная форма гаспадарання.

## А гаспадар — адзін

«Праўда, сумняваюся, ці яна ўсё ж такая калектыўная, як дэкларуецца. У нас дзяржава — гаспадар, але гаспадар дрэнны, разумееце? Калгас толькі лічыцца калектыўнай гаспадаркай. Але калі адзін бесталковы — гэта таксама не гаспадар. Думаю, прыватнік павінен валодаць вялікімі латыфундыямі, а дзяржава яго павінна толькі крыху тыкаць: ты, маўляў, павінен выкарыстоўваць зямлю паводле прызначэння, павінен араць, сеяць, займацца вытворчасцю. Але гаспадар павінен быць адзін, заўсёды. Няхай у яго будуць працаўнікі, хай яны будуць сацыяльна абароненымі. Але гаспадар — адзін. Дарэчы, прыватнік павінен быць усюды, і не толькі ў сельскай гаспадарцы. Прыватнік павінен быць і ў прамысловасці, і ў іншых галінах эканомікі. Гэта ж сёння ўжо і каню зразумела».

Уладзімір Матусевіч — з ліку першых фермераў Беларусі. Кажа, што за два дзясяткі гадоў нічога істотнага не змянілася — кіраўнікі па-ранейшаму ў штыхі сустракаюць прыватніка.

«Трымаюцца за мінулае, але рабіць гэта ўсё цяжэй. А аддаць прыватніку па-ранейшаму баяцца — хоць у вёсках хутка і людзей не застанецца. За дваццаць гадоў, калі мы ў 1991-м атрымалі незалежнасць, можна было нешта зрабіць. Але мы толькі закансерваваліся ў развіцці».




Ён верыць, што ягоны маёнтак прастаіць сотні гадоў.



«Работнікі могуць быць найманымі, але гаспадар павінен быць адзін!» — кажа Матусевіч.



Ферма спецыялізуецца на гароднiне.



На 40 га кожны лапік аброблены.

## Натуральны адбор

У той жа час Матусевіч верыць у лепшае: «Як толькі пачыналі, у нас былі чатыры тысячы фермераў, зараз засталіся дзве тысячы. Гэта нармальна, таму што не ўсе могуць гэтым займацца, тут натуральны адбор. Гэта эвалюцыя, тут патрэбныя гады, а мы захацелі ўсё за адзін раз».

«Маёнтак Матусевічы» спецыялізуецца перадусім на гародніне. Вырошчваюць усе віды капусты, якія ёсць у свеце, а таксама цыбулю, салеру, пятрушку. Слабасць гаспадара — кветкі. Ім аддадзеныя цэлыя плантацыі, яны — абавязковы элемент шматлікіх альпійскіх горак і акультураных ландшафтаў.

## «Ні ў кога не прашу»

Уладзімір Матусевіч усцешаны, што ўкладзеныя ў развіццё аграрнага бізнэсу сілы не змарнаваліся. Прынамсі, ён абгрунтавана можа назваць сябе «самадастатковым арганізмам», незалежным ад настрою чыноўнікаў: «Я не прашу кожны год грошы на пасяўную і ўборачную. Гэта — мае праблемы. Адзіная рэальная праблема гаспадара — збыт. Мой клопат які? Гербіцыды купі, паліва купі, угнаенне купі. Гэта жывыя грошы, разлікі, складаныя схемы. Я гарантую аплату пад заробак ад рэалізацыі прадукцыі, ужо зараз зарабіў на цыбулі. Але ж я ні ў кога не прашу! А калгасы — у мільярдных даўгах. Яны чакаюць, калі ім запазычанасці спішуць, калі ім сумы «пагасяць». Але ж гэтыя грошы аднекуль узялі. З таго ж «Беларуськалія», аднекуль з мінскіх прадпрыемстваў, з мытні. Нам не далі, вам не далі; адабралі — і ў гэтую прорву. А я ж сам кручуся, не прашу, каб мяне субсідыявалі. Жонка пайшла на пенсію з маёй гаспадаркі, сын працуе, нявестка, я працую; мы лічымся тут, я раблю ўнёскі ў фонд дзяржаўнага страхавання, іншыя плацяжы. Я не прашу працы, не прашу хлеба. Я сам сябе ўсім забяспечваю».

Да ўсяго, Уладзімір Матусевіч — фермер з яскрава акрэсленым нацыянальным ухілам. Доўгі час над ягоным маёнткам лунаў бел-чырвона-белы сцяг, аднак урэшце гаспадар саступіў просьбам мясцовых уладаў не «падстаўляць» іх перад вышэйшым начальствам.

Матусевіч — заўсёдны ўдзельнік мерапрыемстваў дэмакратычнай апазіцыі. Аднак прызнаецца, што цяпер засмучаны адсутнасцю адзінства ў шэрагах дэмакратаў.

**Ігар Карней,**
**радыё «Свабода»**

# Наша жыццё — проста жах

Заробку за месяц хопіць толькі на наём кватэры, квартплату, аплату мабільнага тэлефона і пару булак хлеба. Піша маладая мама, жонка доктара.

Завуць мяне Вольга. Я педагог-філолаг па адукацыі, нарадзілася і вырасла ў Мінску. Сваёй працай я задаволеная — займаюся рэдактурай, у асноўным праца дома і праз інтэрнэт.

Два гады таму я выйшла замуж за выпускніка Медыцынскага ўніверсітэта, таксама мінчука, і ў хуткім часе, пасля ягонай стажыроўкі, нібыта жонка дзекабрыста, паехала за ім у раённы цэнтр Мінскай вобласці, куды ён быў накіраваны па размеркаванні, для працы ў цэнтральнай раённай бальніцы, аддаць доўг радзіме.

Тое, што мы тут як людзі нікому не патрэбныя, стала зразумела адразу па прыездзе: у маім мужу мелі патрэбу толькі як у фізічнай асобе, здольнай закрыць кадравую дзірку. Максімум, што нам змаглі прапанаваць (сказаўшы, што нам вельмі пашанцавала), — гэта пакой у інтэрнаце.

Мы не сталі спрачацца і паехалі на ўскраіну горада паглядзець на прапанаванае нам жытло. Мы ўбачылі абсалютна жахлівага выгляду барак з аблупленымі сценамі і дзе-нідзе закрытымі цэлафанам вокнамі. Муж хацеў адразу развярнуцца і бегчы адтуль, але я ўпэўніла яго зайсці. І хутка пра гэта пашкадавала. Праз паўгадзіны пошукаў камендантa да нас выйшаў паўп'яны чалавек няпэўнага полу з барвова-сінюшным колерам твару (аказалася, што гэта ўсё ж жанчына). Яна прамычала, што вольных месцаў пакуль няма, але хутка мусяць з'явіцца.

Мы падняліся на другі паверх. Пах у калідоры стаяў такі агідны, што мяне пачало нудзіць. Але найгоршае чакала наперадзе. Аказалася, што на дзесяць пакояў прыбіральня — адна. Такой страшнай прыбіральні я не сустракала ніколі ў жыцці. На ўвесь паверх функцыянавала адна ванна, але з-за рудавата-чорнага налёту яе эмаль увогуле не праглядалася. Я сказала мужу: «Тваё размеркаванне — гэта горш, чым турма ці Сібір...»

У выніку мы былі вымушаныя зняць кватэру. На пытанне да адміністрацыі бальніцы пра магчымую кампенсацыю найму жылля нам спачатку адказалі, што такога расходнага артыкула ў бюджэце няма, але хутка пачалі плаціць па адной базавай велічыні — 35 тысяч рублёў. Колькі квадратных метраў яны кампенсуюць?!

Муж пачаў выконваць свой абавязак у бальніцы. Праўду кажучы, ён марыў быць доктарам усё жыццё і рабіў для гэтага ўсё магчымае: школа з медалём, 6 гадоў неймавернa цяжкага навучання ва ўніверсітэце, потым — сёмы год стажыроўкі, незлічоная колькасць экзаменаў, залікаў, клятва Гіпакрата... І вось ён — ДОКТАР! Так — з вельмі напружанай працай, так — з вялізнай адказнасцю за жыццё людзей, так — з высокімі патрабаваннямі да ўласнага фізічнага і маральнага аблічча, так — з цэлым шэрагам абмежаванняў для сябе асабіста. Але затое — любімая справа.

Ён з галавой сышоў у працу, а вечарамі з захапленнем расказваў, як яму падабаецца лекаваць... Але аднойчы ён прыйшоў нейкі паніклы і разгублены. Я падумала, непрыемнасці на працы, складаны хворы. Але ён з нейкім пачуццём сораму і выбачэння падаў мне свой першы разліковы лісток. 515 тысяч! У яго былі слёзы на вачах. Упершыню ў жыцці. Ён чакаў гэтага моманту — моманту, калі ён будзе здольны самастойна забяспечваць сябе і сваю сям'ю, — сем гадоў. А цяпер разумеў, што ягонага заробку за месяц хопіць толькі на наём кватэры, квартплату, аплату мабільнага тэлефона і пару булак хлеба.

Цяпер у яго пачалося іншае жыццё — ужо не было таго захаплення сваёй працай, таго гарачага энтузіязму, з якім ён ішоў у бальніцу кожны дзень. Ён зразумеў, што ў нашай дзяржаве быць доктарам — гэта выракаць сябе і сваю сям'ю на жабрацтва. Высакароднае жабрацтва.

Калі я даведалася, што чакаю дзіця, я не ведала, як яму пра гэта сказаць, каб не забіць канчаткова. Але хутка прыйшла палёгка — ён быў шчаслівы ад гэтай навіны. Адразу збег і вярнуўся толькі праз гадзіну з сумкай розных далікатэсаў і букетам гваздзікоў. Цяпер праслязілася я. Я ведала, што да яго заробку яшчэ 5 дзён, што грошай у яго амаль не засталося. Але ён вельмі хацеў, каб гэты дзень быў для нас асаблівым. І, як я высветліла пазней, пазычыў грошай у суседа, мясцовага таксіста.

Разумеючы, што ў хуткім часе яму давядзецца забяспечваць яшчэ і дзіця, ён узяў дадатковую падпрацоўку, дадатковыя начныя дзяжурствы. Двое яго калегаў, папярэдняга выпуску, звольніліся адразу пасля заканчэння высылкі — адзін пераехаў у Расію, другі перайшоў у фармацэўтычную фірму. Апроч мужа, у аддзяленні застаўся толькі загадчык, якому 64 гады.

Цяпер я бачыла мужа толькі зрэдку і мімаходам, заўсёды без сілаў, з вялікім цяжарам стомы. Ён фактычна жыў у бальніцы. Мне здавалася, што вось цяпер ён атрымае вар'яцкую суму грошай і будзе задаволены. Выніковая сума ў разліковым лістку была такая: 968 тысяч. Ягоная стома змянілася дэпрэсіяй. Я сышла ў дэкрэтны адпачынак, цяпер не працую. І з жахам назіраю, як у нашай краіне забіваюць усялякае жаданне жыць у ёй і працаваць на карысць людзей.

Калі мой муж скончыў універсітэт, яму далі невялікую кніжку, дзе было напісана пра яго правы як маладога спецыяліста. Праз месяц пасля пачатку працы і «рэалізацыі» гэтых «правоў» мы выкінулі яе ў смецніцу — туды ж, куды ў нашай дзяржаве выкідаюць дактароў.

Хутка нашая высылка скончыцца. Мы, безумоўна, з'едзем. Як з'едуць і ўсе наступныя выпускнікі. Бо ТАК жыць чалавеку нельга.

Увесь гэты час мяне хвалявала адно пытанне. Чаму нічога не робіць у нас тыя дзяржаўныя і грамадскія інстытуцыі (міністэрствы, прафсаюзы), якія абавязаныя гэта рабіць? Няўжо яны не ведаюць пра сітуацыю? Адказ быў відавочны: ведаюць, але нічога не робяць, бо іх партфелі ім даражэйшыя за будучыню нашай краіны і медыцыны.

Ці ж такія людзі могуць штосьці для нас зрабіць?

**Вольга Іванова,**
**адрас у Рэдакцыі**

# Я знайшла сваю мову, дзякуючы хлопцу

І зараз ужо не кіну яе. Піша студэнтка з Мінска **Міхаліна Дзятлік**.

Як я радая цяпер, што напярэдадні майго паступлення ў першы клас склалася такая сітуацыя. Тады гэта быў стрэс для маіх бацькоў. У школу, да якой я адносілася па месцы жыхарства, мяне адмовіліся прымаць: у іх быў перабор вучняў. У прэстыжнай школе з англійскім ухілам, куды пайшлі ўсе мае сяброўкі, на экзаменах мне наўмысна заніжалі адзнакі. Знаёмыя казалі (бо ведалі на ўласным досведзе), што трэба даць хабар дырэктару. Не ведаю, ці то ў нас не было грошай, ці то не пажадалі даць хабар, але пытанне школы так і заставалася нявырашаным. Тады тата ўзяў мяне за руку і павёў у беларускую нацыянальную гімназію за шэсць аўтобусных прыпынкаў ад дома.

Экзамены на той час ужо скончыліся, але настаўніца, да якой мы зайшлі ў клас, згадзілася правесці са мной уступнае тэставанне. Калі я выканала ўсе заданні і адказала на ўсе пытанні, бацькі пацікавіліся, колькі ім чакаць вынікаў. На што настаўніца галасам, поўным захаплення, адказала, што не трэба чакаць, што такую разумную дзяўчынку яна адразу забірае ў свой клас.

Навучанне на беларускай мове ішло натуральным чынам, нягледзячы на тое, што сям'я ў мяне цалкам расейскамоўная. Я не памятаю, калі зразумела, што ў маёй краіне двухмоўе, але ў памяці заўжды стаіць адна карціна. Раніца. Бацька па слізкай сцяжынцы вядзе мяне да аўтобуснага прыпынку. Я, напэўна, навучаючыся ўжо ў другім класе, бо хвалюся, што ведаю ўжо даволі шмат беларускіх слоў. Прашу тату, каб ён назваў мне слова на рускай мове, а я перакладу яго на беларускую. Тата загадвае слова «зонт». Падумаўшы хвіліну, я ўпэўнена кажу, што так і будзе. А ў адказ чую, што «зонт» па-беларуску — гэта «парасон».

Мінаў год за годам. Я добра разумела беларускую мову і трошкі горш расейскую. Усе тэрміны з прадмета расейскай мовы кшалту «подлежащее», «сказуемое», «имя прилагательное» я не разумела, не магла запомніць беларускія адпаведнікі і ўвесь час блытала іх. Не разумею я іх і зараз. Часам, гаворачы яшчэ па-расейску, кажу якоесьці адно беларускае слова, а потым з засмучанай усмешкай паўтараю яго яшчэ некалькі разоў, але не магу ўспомніць перакладу на расейскую мову і даводзіцца тлумачыць яго сэнс для суразмоўцы іншымі словамі.

Напрыканцы дзявятага года навучання лёс склаўся так, што далей вучыцца ў гімназіі было проста немагчыма, і таму я вымушана была шукаць іншую школу. І няцяжка здагадацца, што новая школа была расейскамоўнай, як і сотні іншых школ у нашай краіне. І, верагодна, на гэтым маленечкім вітку далёка не сусветнай і нават не нацыянальнай гісторыі знік бы яшчэ адзін беларус. Але, як пакажа гісторыя далей, той беларус тады яшчэ не нарадзіўся.

А нараджэнне гэтае адбылося, калі я паступіла ва ўніверсітэт. Аднойчы, недзе на другім месяцы навучання, вяртаючыся дадому разам з хлапцамі з майго курса, якія таксама ездзяць на метро, я пачула, як адзін з іх спрабуе размаўляць па-беларуску. Спрабуе няўпэўнена і, відаць, хутчэй за ўсё, жартуе... Але калі ў другі раз выпала вяртацца дадому разам, я зноў пачула беларускую гаворку. А на чацвёрты ці пяты раз я пацікавілася ў таго хлопца, ці даўно ён размаўляе на беларускай мове.

— Не, я толькі вучуся, — пачула ў адказ.

Я тады запэўніла яго, што ў яго вельмі добра ўдаецца, і, каб падтрымаць, стала таксама адказваць па-беларуску.

А тым часам недзе глыбока ў маёй душы прачнулася ці то рэўнасць, ці то зайздрасць і нейкі спаборніцкі інстынкт. Усё разам гэта ператварылася ў ціхае і добрае абурэнне тым, што вось нейкі хлапец вучыцца размаўляць на беларускай мове, а я, праседзеўшы дзевяць год у беларускай нацыянальнай гімназіі, чамусьці размаўляю па-расейску. І тады я перайшла на беларускую мову ў гутарках з бабуляй і дзядулем, з самымі блізкімі сябрамі. Па першасці часта забывалася, саскоквала на расейскую, а сама беларуская гаворка, што ішла з маіх вуснаў, была запаволенай, бо ўсё ж за два гады расейскамоўнай школы родныя словы трохі пазабываліся. Але неўзабаве забытае ўспомнілася, я пачала развіваць сваю мову, шукаючы новыя і цікавячыся незнаёмымі словамі... І нарадзілася яшчэ адна беларуска.

І як з Новага года людзі пачынаюць новае жыццё, так і я з 2009 год значна пашырыла кола тых маіх знаёмых, з кім размаўляла па-беларуску, а з самага пачатку 2010 года я размаўляю на роднай мове з усімі, з кім увогуле даводзіцца размаўляць. І нічога, што ўсе вакол размаўляюць са мной па-расейску і толькі два чалавекі неяк спрабуюць таксама адказваць мне на беларускай мове. Але я зараз ужо не кіну беларускай мовы і не вярнуся да расейскай.

**Суша пра пераход на мову: «Каб барада адрасла, трэба трошкі пахадзіць няголеным».**

Алесь Суша, адзін з пачынальнікаў руху за незалежнасць: «Каб адрасла барада, трэба трошкі пахадзіць няголенаму. Калі хочаш загаварыць [па-беларуску], значыць, нейкі час будзем размаўляць з памылкамі».

Урывак з цыкла перадач Сяргея Дубаўца пра гісторыю «Майстроўні» — першай незалежніцкай суполкі 1980-х.

# Беларусь і ЕС — супрацоўніцтва па ўсіх кірунках

Адукацыйныя праграмы для моладзі, падтрымка навуковых даследаванняў, памежныя праекты, энергетыка, навакольнае асяроддзе, ахова здароўя, транспарт — гэта далёка не поўны спіс сфераў супрацоўніцтва ЕС і Беларусі. Аб'ём усіх праектаў паміж Беларуссю і ЕС складае каля 40 млн еўра.

Ужо год увага грамадскасці прыкаваная да Усходняга партнёрства. Але гэта толькі адна з ініцыятываў, што ўзбагацілі еўрапейскую палітыку добрасуседства. Яна ўключае цэлы шэраг праграм: нацыянальных, рэгіянальных, некалькі міжрэгіянальных, а таксама праграмы транспамежнага супрацоўніцтва. Вось некалькі прыкладаў супрацоўніцтва ЕС і Беларусі.

## Еўрапейскія далягляды для беларускіх студэнтаў

Для Беларусі дзейнічаюць чатыры маштабныя адукацыйныя праграмы: «Тэмпус», «Эразмус Мундус», «Жан Манэ» і «Моладзь у дзеянні».

У праграме «Тэмпус» Беларусь удзельнічае ад 1993 года і стала часткай больш чым 100 праектаў з удзелам розных універсітэтаў. Семінары, новыя метады выкладання замежных моваў і інфарматыкі, з'яўленне новых прадметаў — прыклады зменаў у беларускіх ВНУ з дапамогай «Тэмпуса».

Праграма арыентаваная на інтэграцыю Беларусі ў Балонскі працэс, мэта якога — стварыць агульную прастору еўрапейскай вышэйшай адукацыі.

Яшчэ адна праграма, арыентаваная на падтрымку даследаванняў еўрапейскай інтэграцыі і папулярызацыі ідэі аб'яднанай Еўропы, — «Жан-Манэ». З яе дапамогай выкладчыкі і навукоўцы могуць атрымаць грант на стварэнне адпаведных кафедраў, на навучанне і даследаванні ў Еўропе.

«Моладзь у дзеянні» разлічаная на моладзь ад 13 да 26 гадоў і падтрымлівае розныя культурныя і адукацыйныя праекты. Мэта праграмы «Эразмус Мундус» — спрыяць мабільнасці студэнтаў, выкладчыкаў, аспірантаў і дактарантаў. Беларускія бакалаўры, магістры і аспіранты могуць атрымаць стыпендыю ад трох месяцаў да трох гадоў на навучанне ў краінах ЕС. Стыпендыі хапае і на аплату праезду, і на візавыя выдаткі і страхаванне, і на пражыванне ў краіне навучання. Дзякуючы ўдзелу ва Усходнім партнёрстве, колькасць квотаў на «Эразмус Мундус» для беларускіх студэнтаў мусіць павялічыцца, а значыць, павялічацца і шанцы паехаць вучыцца ў Еўропу.

## Беларускае малако — у Еўропу!

Штогод у рамках Нацыянальнай праграмы эксперты Еўрасаюза аналізуюць патрэбы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі і, кансультуючыся з беларускімі міністэрствамі, вызначаюць прыярытэтны сектар беларускай эканомікі.

У 2007 годзе ЕС падтрымліваў энергетычны сектар Беларусі, у 2008 — навакольнае асяроддзе, у 2009 — стандарты ў сферы якасці прадуктаў харчавання. Прыярытэт 2010 года — стандартызацыя ў галіне энергаэфектыўнасці.

Хоць год стандартаў у сферы якасці прадуктаў харчавання завяршыўся, праца ў гэтым кірунку працягваецца. Каб праверыць, ці можна прымаць Беларусь у экспарцёры малочных, жывёльных і мясных прадуктаў, у нашу краіну прыязджаў шэраг экспертаў ЕС. Яны наведалі «Савушкін прадукт», «Бабушкину крынку», «Бярозаўскі сыраробны камбінат».

Першым заводам у Беларусі, які атрымаў еўрапейскі сертыфікат адпаведнасці сістэме менеджменту якасці і бяспекі прадуктаў, стаў Верхнядзвінскі масласырзавод. Цяпер завод чакае дазволу Офіса ветэрынарыі ЕС, які адкрые беларускім прадуктам «акно ў Еўропу».

**Андрэй Елісееў**

# Балет «Мефіста»: першая ластаўка новай вясны



Музкамедыя выходзіць з летаргічнага сну, у які яго загнаў былы мастацкі кіраўнік. Піша **Юлія Андрэева**.

З'явіліся цікавыя канцэртныя праграмы. 9 чэрвеня Музычны тэатр пачаў доўгатэрміновы канцэртны праект «Музычныя вечары з Аляксандрам Анісімавым». І вось, нарэшце, знакавая падзея для тэатра — узнаўленне балета «Мефіста» ў харэаграфіі выдатнага танцоўшчыка Уладзіміра Іванова на музыку Уладзіміра Кандрусевіча. Яго першая пастаноўка на сцэне Музычнага тэатра адбылася ў ліпені 2002 года. Для Уладзіміра Іванова гэта была дыпломная работа па заканчэнні балетмайстарскага аддзялення Акадэміі музыкі, але ў ёй ён паказаў сябе сталым, арыгінальным творцам.

Музыка Кандрусевіча таксама прайшла экзамен на творчую сталасць. Часткова яна выкарыстоўвалася ў балеце «Мефістофель» на музыку Шарля Гуно — Уладзіміра Кандрусевіча, які быў пастаўлены ў Ніжагародскай оперы (Расія). Для пастаноўкі ў Мінску кампазітар цалкам перарабіў музыку балета. Мастацтвазнаўца Юлія Чурко напісала да яго новае лібрэта. Дый харэаграфія стваралася зусім у іншым стылі, так што атрымаўся зусім іншы балет, цяпер ужо пад назваю «Мефіста».

Поспех быў агромністы. Аднак спектакль нядоўга трымаўся ў рэпертуары. Мастацкі кіраўнік Музкамедыі Аляксей Ісаеў стаў заўзята змагацца з балетам. Яму не падабалася, што балетная трупа Музычнага тэатра рэалізуе сур'ёзныя праекты — такія, як «Жызэль», «Шахеразада», «Мефіста». Магчыма, пэўны ціск быў з боку кіраўніка Опернага, спадара Елізар'ева. Бо напачатку 2000-х балет Музкамедыі ствараў занадта моцную канкурэнцыю балетнай трупе Вялікага тэатра, якая перажывае не найлепшы перыяд.

У выніку галоўны балетмайстар Музкамедыі, народная артыстка Ніна Дзячэнка, была звольненая, у тэатры запанаваў дух савецка-калгаснай музычнай камедыі, апафеозам якога стаў «Бабскі бунт».

Пасля сыходу Ісаева тэатр усё яшчэ балансуе між савецкім кітчам і мастацтвам, але перамога кітчу ўжо не відавочная. Хоць спусташэнні, пакінутыя ранейшым кіраўніцтвам, у адзін дзень не залатаеш. Тэатр апынуўся амаль у такім самым становішчы, як на пачатку 1990-х: без грошай у кішэні, без гастрольных кантрактаў. Але тады прыйшла моцная каманда, намаганнямі мастацкага кіраўніка Зміцра Косціна для калектыву настаў сапраўдны залаты век. Правінцыйны Тэатр музычнай камедыі хутка стаў адным з найцікавейшых творчых калектываў краіны. У ім ставіліся оперы, аўтэнтычныя версіі класічных аперэт, цікавыя балеты. Яшчэ крыху — і Музкамедыя стала б для Беларусі нечым накшталт Музычнага тэатра імя Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі ў Маскве. Але яму падрэзалі крылы.

Цяпер перспектыўныя творцы ў тэатры таксама ёсць. Ёсць цудоўны аркестр зусім не «аперэтачнага» ўзроўню, яскравыя артысты. Нядаўна ўпершыню за шмат гадоў з'явіўся галоўны балетмайстар — Зміцер Якубовіч. І гэта дае надзею, што тэатр зноў стане прывабным і для гледачоў, і для тэатральных крытыкаў.

А пакуль 26 і 30 чэрвеня публіцы прапануецца «першая ластаўка» новай вясны — балет «Мефіста» харэографа Уладзіміра Іванова. У галоўных ролях — дыпламанты і лаўрэаты міжнародных конкурсаў Віталь Краснаглазаў, Рыгор Крукоўскі і Рына Івакіры. Сцэнаграфія Змітра Мохава. За дырыжорскім пультам — Мікалай Макарэвіч. І, зразумела ж, цудоўная музыка Уладзіміра Кандрусевіча.

## Ці пан, ці правал

Прэм'ера ў Купалаўскім тэатры: «Тэатраманія» паводле Пітэра Шэфера. Піша **Павал Касцюкевіч**.

Аўтар п'есы (яе назва ў арыгінале — «Летысія і дурнап'ян») — англійскі драматург і сцэнарыст Пітэр Шэфер. Шэфер вядомы сваёй феерычнай драмай «Амадэй», кінематаграфічнае ўвасабленне якой у 1986 г. прынесла аўтару і рэжысёру стужкі Мілашу Форману «Оскар» і «Залаты Глобус».

Адначасова з «Ідыліяй», «Пінскай шляхтай» і Translation'ам, што плоць ад плоці, дух ад духу — купалаўскія, тэатральны флагман працягвае выбудоўваць другую лінію. Паралельная, альтэрнатыўная, называйце як хочаце, гэтая лінія — шэраг п'есаў, далёкіх ад беларускай рэчаіснасці. Яны маюць на мэце не замыкацца на тутэйшай праблематыцы, цягнуць гледача за беларускія далягляды. Якія праблемы нас будуць дапякаць, калі мы наямося і ўрэшце сфармуемся як нацыя, і ў нашых дамах запануе гэтак мілае еўрапейскаму сэрцу нудоцце. І як такія пастаноўкі не ўдаюцца, дык праблема не ў акторах, а ў нас: не дапялі, не дараслі, не дадумалі.

**Гэтыя праблемы нас дапякуць, калі наямося.**

Але калі ў бяспройгрышнай камедыі Франсіса Вебера «Вячэра з прыдуркам» нават неўтаямнічая публіка магла пацешыцца з вясёлых прыгодаў пыхліўцаў і дзівакоў, дык у «Тэатраманіі» ўсё не так. Яе пастаноўка для Купалаўскага — ці пан, ці правал.

«Тэатраманія»: бліскучая ігра, бездакорная п'еса, адно вас павінна пераймаць таямніца, чаму ж перад смяротным пакараннем Марыя Сцюарт начапіла парык. І калі так, дык вы прыемна здзівіцеся: вас чакаюць дзве з паловай гадзіны самага чыстага высокамастацкага дурнап'яну з поўным яго выкрыццём, стракатыя сімптомы тэатраманіі. А таксама танец з шаблямі ў выкананні Зоі Белахвосцік і К перад заслонай. А як не, то не, шаноўныя нетэатраманы і нетэатраманкі.



**У Мінск прыязджала з канцэртам скрыпачка Ванеса Мэй. Апроч спалучэння класічнай музыкі і сучасных рытмаў, яна запомнілася выказваннем, што была б не супраць сыграць дуэтам з Аляксандрам Лукашэнкам — баян плюс скрыпка.**

PHOTO.BYMEDIA.NET

## Дзень Валянціна. Акудовіча

«Валянцін Акудовіч? А, гэта той, якога няма?» Той-той. І днямі яму споўнілася 60 гадоў.

Нягледзячы на дасягненні Акудовіча ў прасоўванні беларускага мыслення і ўклад у развіццё беларускага філасофскага слоўніка, у масавую свядомасць ён патрапіў сваім эсэ «Мяне няма. Роздумы на руінах чалавека». Дакладней, канцэпцыяй, прапісанай у першай частцы загалоўка.

18 чэрвеня беларуская багема сцякалася ў мінскую мастацкую галерэю «Ў», каб адзначыць 60-годдзе філосафа.

«Валянцін Акудовіч здзейсніў прыблізна тое, што Андрэй Хадановіч у паэзіі — ён зрабіў беларускую філасофію хітом: прадметам займальным, яскравым і сэксуальным», — казаў культуролаг Максім Жбанкоў. Удзельнікі строілі кепікі, чакаючы, калі з'явіцца сам аўтар. Але высветлілася, што Акудовіч ашукаў



АЛЯКСЕЙ СМОЛЬСКІ

**Валянціна Акудовіча часам называюць «эстрадным філосафам».**

усіх: не прыйшоў на ўласную вечарыну, бо ў гэты час знаходзіўся на Нёмане, на байдарачным сплаве. І гэтым спраўдзіў сваю тэзу, што... ну, вы самі здагадаліся.

Давялося неяк выкручвацца без яго і для гэтага настроіцца на сур'ёзны лад. Філосаф Уладзімір Мацкевіч зазначыў, што Акудовіч — гэта чалавек, які адраджаў інтэлектуальную прастору Беларусі, які «думае Беларусь». «Спадзяемся, што ў будучай Беларусі будзе месца і для Акудовіча, якога няма», — дадаў Мацкевіч.

Падсумаваў жа даробак Акудовіча філосаф Аляксандр Грыцанаў: «Акудовіч — той масток, які злучае XX стагоддзе беларускага Адраджэння і стагоддзе наступнае, XXI-е, падчас якога мы будзем шмат у якіх аспектах будаваць Беларусь з нуля».

**ПК**

**Валянцін Акудовіч**

нар. у 1950 у мястэчку Свіслач. Філосаф, эсэіст, літаратурны крытык. У 1991—1999 працаваў у тыднёвіку «Культура». У 1999—2000 быў рэдактарам аддзела філасофіі і замежнай літаратуры часопіса «Крыніца», намеснікам рэдактара філасофскага часопіса «Фрагменты». Выкладчык Беларускага калегіума. Аўтар філасофскіх і літаратурна-мастацкіх кніг «Мяне няма. Роздумы на руінах чалавека» (1998), «Разбурыць Парыж» (2004), «Дыялогі з Богам» (2006), «Код адсутнасці. Асновы беларускай ментальнасці» (2007).

### Сцісла

• **Імпрэзы ў дзень народзінаў Быкава.** 19 чэрвеня, у 86-ю гадавіну нараджэння Васіля Быкава, людзі сабраліся ўшанаваць памяць пісьменніка на Усходніх могілках Мінска, ля яго магілы. Кіраўнік кампаніі «Гавары праўду» паэт Уладзімір Някляеў паведаміў, што за называнне вуліц у Мінску і Гродне імем Быкава сабрана ўжо 70 тысяч подпісаў. На радзіме Быкава, у вёсцы Бычкі Ушацкага раёна, адбылося ўручэнне прэміі «За свабоду думкі» імя Васіля Быкава, заснаванай Рухам «За Свабоду», і нацыянальная дыктоўка. Прэмію атрымала стваральніца прыватнага музея з Германавіч (Шаркаўшчынскі раён) Ада Райчонак.

• **Памёр набеліст Жазэ Сарамага.** Партугальскі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры 1998 года Жазэ Сарамага памёр ва ўзросце 87 гадоў. Жазэ дэ Соўза Сарамага трымаўся левых поглядаў, заснаваў Нацыянальны фронт абароны культуры. У 1998 годзе Сарамага атрымаў Нобелеўскую прэмію па літаратуры за раман «Евангелле ад Ісуса», што ўяўляе з сябе альтэрнатыўнае выкладанне евангельскіх падзей.

• **Помнік Барысу Кіту прапануюць паставіць у Навагрудку.** На замову калекцыянера Анатоля Белага выкананы гарэльеф вядомага беларуса. Усталяваць яго плануецца на трохметровым валуне. Але для гэтага трэба атрымаць дазвол ад уладаў. Сп. Белы звяртаўся ў Мінкультуры з просьбай знайсці месца для помніка. З міністэрства яго накіравалі ў Навагрудскі райвыканкам. Але адказу ад мясцовых чыноўнікаў няма. Ніякіх фінансавых укладанняў ад дзяржавы сп. Белы не просіць.

**КМ**



# Голая праўда

**Аляксандр Апон.** Сатырычнае апавяданне.

Усё пачалося, як і мае быць, з першай асобы. У нашым выпадку — з прэзідэнта Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.

— Усё, не магу болей трываць! — сказаў ён раніцай за снеданнем і кінуў відэлец на талерку.

Лёкай, які прыслужываў яму за сталом, падумаў, што Лукашэнка мае на ўвазе яго, і закалаціўся як асінавы ліст ад страху страціць самае выгаднае ў краіне лёкайскае месца. Дрыготкім ад роспачы голасам ён асмеліўся запытацца, што не так.

— Ды пры чым тут ты! — адмахнуўся Лукашэнка і, ускочыўшы, пабег са сваёй сталовай у адзін з кабінетаў, каб званіць у Адміністрацыю.

— Алё, Макей? — крыкнуў ён у трубку спецсувязі.

— Слухаю Вас, Аляксандр Рыгоравіч, — адазвалася трубка.

Галоўны памочнік быў на працы, нягледзячы на ранні час.

— Вось што, Валодзя, тэрмінова збірай журналістаў, буду даваць прэс-канферэнцыю.

— А што так, Аляксандр Рыгоравіч, зняцку? На якую тэму? — насцярожыўся Макей.

— Ды няма больш сілы трываць, — прызнаўся Лукашэнка. — Колькі можна хлусіць? Трэба нарэшце сказаць усю праўду!

— Даўно пара, — выдыхнуўшы з палёгкай, падтрымаў Лукашэнку Макей.

Такім чынам, на адзінаццатую ранку таго самага панядзелка была абʼяўленая тая самая знакамітая, пасля вядомая ўсяму свету пад назвай «Голая праўда», прэс-канферэнцыя.

Зала для прэс-канферэнцый гула, а ў буфеце на першым паверсе быў выпіты тыднёвы запас каньяку і гарэлкі, так што буфетчыку прыйшлося адкаркоўваць бутэлькі з чырвоным віном па сто і болей даляраў.

— А вы не ведаеце, што здарылася? Чаго такая спешка? — напаўголаса пыталіся адзін у аднаго паднятыя як па трывозе рэдактары дзяржаўных газет.

Без адной хвіліны адзінаццаць увайшоў белы як труп Макей і дрыготкім ад хваляваньня голасам сказаў:

— Панове, прашу цішыні. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка.

«Няўжо абʼявіць пра адстаўку?!» — ахнула пра сябе зала. Але ў адстаўку Аляксандр Рыгоравіч не збіраўся: наадварот...

— Таварышы, сябры, паплечнікі, — пачаў ён. — Я ўжо, як вы ведаеце, шаснаццаць год сяджу ў прэзідэнтах. Народ мне давярае і хоча бачыць мяне на гэтай пасадзе ўсё астатняе жыццё. Але час не стаіць на месцы. Я прыйшоў да высновы, што нам трэба канчаць з хлуснёю, якая апанавала нашу краіну як спрут і пачаць гаварыць праўду, якая б горкая яна ні была. Я вырашыў пачаць з сябе...

Тут Лукашэнка спыніўся і цяжка ўздыхнуў:

— Дык вось, таварышы, па-першае, усё гэта трызненне сівой кабылы, што ў прэзідэнты ідуць дзеля нейкага там народа. Пляваць мы, прэзідэнты, на народ хацелі! Вось узяць мяне. Ды каб я пра народ думаў, хіба зрабіў бы з яго бяспраўнае, бязмоўнае быдла? Не-е! — выставіўшы руку, памахаў ён пальцам перад залай. — А сам хіба жыў бы ў палацы ў Драздах як турэцкі султан, хоць, як халасцяку, хапіла б і двухпакаёвай кватэры? Ды не, куды там да мяне турэцкім султанам, — летуценна ўсміхнуўся ён. — У мяне ў асабістай ахове людзей больш, чым у любога з іх янычараў было, і гарэм мог бы быць не меншы. Я ўжо не кажу пра «Мерсэдэсы», «Боінг», лыжы і іншы спортінвентар... А гэта ж усё замест лекаў для хворых, інвалідных калясак для калек, ежы для дзяцей, пенсій для старых, новых рабочых месцаў... Але што тут казаць! — скрывіўся ён, і затым зноў махнуўшы рукой, усклікнуў. — Эх, вы і самі ўсё добра ведаеце! — сеў і прысаромлена апусціў галаву.

— Ведаем! — ускочыў Макей, які сядзеў увесь час як на іголках. — Ведаем, паважаны Аляксандр Рыгоравіч, бо самі не лепшыя. Свайго сына, старэйшага, ад першай жонкі, я не паслаў пасля інстытута на работу ў Хойнікі і Брагін, а простым ходам у Швейцарыю.

Тым часам па краіне ўсе заводы, фабрыкі, будоўлі спынілі працу. Людзі сядзелі ў чырвона-зялёных кутках, вырачыўшыся перад тэлевізарамі.

Слова ўзяў міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі.

— Таварышы! — не сваім голасам закрычаў ён, увесь калоцячыся, як кавалак жэле на талерцы. — Я ўчора зʼеў за адзін прысест тры колцы пальцам пханых кілбас, пасмажаных у свіных скварках. (Гэтую нашу беларускую вясковую страву я люблю больш за ўсё на свеце.) І гэта ў той час, калі многія дзеці проста галадаюць. Я абабраў дзяцей! — ускрыкнуў ён і заплакаў па галодных дзецях як бабёр, слязьмі вялічынёю з арэх.

— А я, — выступіла Лілія Ананіч, якая не захацела адрывацца ад начальства, — дала ўчора папярэджанне газеце «Народная воля» на роўным месцы. Гэта мне загадала зрабіць Пяткевіч. Ды хай яна сама скажа, было такое ці не.

— Што было, тое было, — адразу прызналася Пяткевіч. — Але я не бачыла іншага выйсця, бо адчувала, што газета дапякла Вам, Аляксандр Рыгоравіч. Ды вось Сева Янчэўскі не дасць схлусіць.

— Гэта не я, гэта мне старшыня Рады бяспекі па тэлефоне загадаў! — пачырванеў Сева. — Загадаў, каб з «Народнай воляй» і іншымі такімі газетамі мы болей не цацкаліся. А я нічога яму запярэчыць не мог, бо чалавек бязвольны, вы самі разумееце.

Усё гэта транслявалася ў жывым эфіры на ўсіх пяці тэлеканалах, а таксама па радыёкропцы. І ўсе «Навіны» і «Панарамы» пачыналіся з прэс-канферэнцыі. Народ з цяжкасцю даваў веры вачам і вушам. Сёй-той нават быў упэўнены, што гэта ўсё інтрыгі апазіцыі, якая захапіла ў Мінску тэлебачанне і радыё і, узяўшы ў закладнікі акцёраў тэатра «Хрыстафор», зрабіла інсцэніроўку. А сам Лукашэнка з сынамі ў свайго сябра Уга Чавеса пад Каракасам на віле, Праляскоўскі — у любай яго сэрцу Маскве, а Макей — на Жэнеўскім возеры... Наглядзеўшыся тэлевізара, краіна не спала ўсю ноч.

А на другі дзень «Советская Белоруссия» выйшла накладам у мільён. Асобнікі раздавалі на вуліцы бясплатна міліцыянты і сябры БРСМ. Аўтарам рэдакцыйнага артыкула пад назвай «Краіна, дзе не хочацца ні жыць, ні працаваць», быў сам Павал Якубовіч, які не стаў хавацца пад сваім звычайным псеўданімам Суперазотаў ці як там яшчэ. «Жыць так далей і працаваць няма ніякай магчымасці, — пісаў ён. — Забіты, затурканы, спіты да апошняй рыскі народ просіць паратунку і патрабуе перамен. Далей, але пад тым жа кіраўніцтвам, бо коней на пераправе не мяняюць, мы пойдзем іншым шляхам, устанем як адзін з каленяў, адарвем пысы ад рыльцаў бутэлек і шырока пакрочым у светлае заўтра. Больш няма месца абрыдлівай страшнай хлусні, а ёсць толькі голая, як сляза ці пяршак, праўда...»

**— Няма больш сілы трываць, — прызнаўся Лукашэнка. — Колькі можна хлусіць? Трэба нарэшце сказаць усю праўду!**

Праз гадзіну пасля таго, як «Советская Белоруссия» разышлася да апошняга асобніка, па тэлебачанні выступіў прэмʼер-міністр Сідорскі. Ён пакаяўся за тое, што апошнія гады ніхто з чальцоў яго ўрада не праяўляў ініцыятывы, а толькі выконвалі распараджэнні з Адміністрацыі ці стараліся жаданні Адміністрацыі прадугадаць. Што сядзелі на таннай расійскай нафце ды выводзілі статыстыку.

— Прыйшоў час, — сказаў ён, — падумаць пра шматпакутны беларускі народ, пра новыя заводы і фабрыкі, чалавечыя, у сэнсе велічыні, пенсіі і стыпендыі, пра дапамогу дзецям, інвалідам і нармальныя, якія лечаць, а не барысаўскія лекі.

Сідорскага змяніў старшыня палаты прадстаўнікоў Андрэйчанка, які, унурыўшы галаву ў паперу, зрабіў афіцыйную заяву. Што ніякі ён не народны прадстаўнік, а ўзурпатар, бо сапраўдных выбараў не было, а была прафанацыя. І хто перамог насамрэч — ён, Андрэйчанка, ці сябар БНФ, які балатаваўся ў дэпутаты ў той самай акрузе, — трэба пытацца ў Ярмошынай з Лазавікам.

— Ды адкуль я магу ведаць, хто з вас перамог! — завялася Ярмошына, і яе хрыплаваты, хіба пракураны голас завібраваў. — Апошнія, як, дарэчы, і першыя, выбары ў нашай краіне былі ў 1994 годзе. А хто і каго выбіраў пасля гэтага — мне невядома. Усе прозвішчы пераможцаў нам прадказвалі ў Адміністрацыі прэзідэнта. Там пытайцеся.

— Ага, — склаў на грудзях ручкі, як перадпенсійны херувім, паглядаючы з неба на зямлю, Лазавік. —Я як сакратар ЦВК магу гэта засведчыць.

Ад усёй праўды, што абрынулася на галовы людзей у чэрвені, можна было зʼехаць з глузду. Многія так і зрабілі. Санітары ледзь паспявалі на выклікі, у псіхдыспансерах не засталося ніводнага вольнага месца ў палатах, былі застаўленыя ложкамі ўсе калідоры і лесвічныя пляцоўкі. І калі прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі і бальшыня прадпрымальнікаў убачылі ў праўдзе святло ў канцы бясконцага тунэля, шмат хто з так званых простых людзей бліжэй да вечара пачынаў незадаволена круціць носам.

— Не падабаецца мне гэтая праўда. Не падабаецца, — сказаў жонцы Толік Папроцкі, рабочы будаўнічай фірмы, прывалокшыся з працы дахаты. І выпіў.

— А што такое? — запыталася жонка, завіхаючыся ля газавай пліты.

— Як што?! — выцер сухім парэпаным кулаком вусы Віця. — Учора тры мяшкі цэменту з хлопцамі занықалі, каб налева пусціць, мяшок польскай тынкоўкі і пару клеявога раствора, а тут на табе — праўда! А на храна нам гэтая праўда?

— Ды і ў нас... — згадзілася жонка. — Што ж мы есці будзем, калі я сумленна працаваць пачну, калі нікога не абважваць? На трыста тысяч іхнія качацца?

— Так, так, — згадзіўся Толік, бо і яму жыццё без скваркі не здавалася зайздросным. Як, дарэчы, і яго дачцэ-настаўніцы.

— У нас цяпер выкладанне ўсіх прадметаў будзе выклюна на беларускай мове, — ледзь стрымліваючыся, каб не раскрычацца, як на ўроку перад дзецьмі, сказала яна. І дадала: «В жопе я видела их белорусский язык».

Але апошняй кропляй стала выступленне па тэлевізары мітрапаліта Філарэта.

— Браты і сёстры! Не верце вы нам, папам, калі мы кажам, што нешта ведаем пра Бога. Бо служым мы выключна Вялікай Расійскай імперыі, каб смачна есці і піць, салодка і доўга спаць. Вось, браты і сёстры, самая што ні ёсць сапраўдная, шчырая праўда.

— А божачкі! — вырачыўшы вочы на тэлевізар, склала рукі старая баба Папроцкіх. — А як жа мне далей жыць, на што спадзявацца?

І плюнула на тэлевізар:

— Цьху на цябе, ірад пракляты! Не трэба мне тваёй праўды!..

Зранку падняўся амаль увесь народ. У прамым і пераносным сэнсе: устаўшы з ложкаў, так-сяк апаласнуўшыся і паснедаўшы на хуткую руку, людзі выйшлі з пратэстам на вуліцы, пад саматужнымі чырвона-зялёнымі сцягамі і транспарантамі: «Не — «праўдзе!» , «Далоў прэзідэнта-здрадніка і яго памагатых!»,«Няхай жыве хлусня!»

— Ну, вось бачыце, таварышы, — кісла ўсміхнуўся Лукашэнка найбліжэйшым паплечнікам, стоячы ля акна ў сваім кабінеце на Карла Маркса, 38. — Не дарос наш народ да праўды, не трэба яна яму.

А пасля, цяжка ўздыхнуўшы — маўляў, не хочацца, але нічога не паробіш, такі ўжо мусіць лёс, — закамандаваў:

— Падымайце АМАП і ганіце ў стойла. Пагулялі, хопіць!

*Гродна*

**Друкуецца ў газетнай версіі, скарочана**

# Топ-10 фразаў, якія нельга казаць шэфу



Як сцвярджаюць складальнікі рэйтынга, дастаткова выключыць іх са свайго лексікона, каб зрабіць сабе, свайму начальніку і сваёй кар’еры неацэнную паслугу.

### 1. «Ох!..»

Дэманстратыўны ўздых супрацоўніка кіраўнік успрымае як стоеную агрэсію. «Зрэшты, усе мы ведаем, што сам па сабе ўздых азначае раздражненне і незадаволенасць», — адзначаюць складальнікі рэйтынга.

### 2. «Мне мала плацяць за гэта»

У 99% выпадкаў супрацоўнік, які гэта скажа, зробіць памылку. Фраза належыць да самых распаўсюджаных адгаворак ад працы. А самым папулярным адказам на яе можа быць: «Тады звальняйцеся і шукайце іншае месца для свайго вялізнага нерэалізаванага патэнцыялу!»

### 3. «Я так адцягнуўся ўчора...»

...А шэф ужо здагадваецца, чаму вы не паспяваеце з рабочым планам. Такія размовы таксама могуць навесці яго на думку, што для супрацоўніка не існуе мяжы паміж працай і асабістым жыццём, а магчыма, ён увогуле чалавек без тармазоў. Значыць, не варта давяраць яму адказныя праекты.

### 4. «Я дадам вас у сябры на «Аднакласніках»

Такая прапанова можа паставіць шэфа ў няёмкае становішча. Ён можа апынуцца дастаткова дурным, каб пагадзіцца, але для ўсіх будзе лепш, калі адмовіцца. Гэта не значыць, што з ім нельга проста пабалбатаць на офіснай вечарынцы, аднак мала хто з начальнікаў любіць увагу падначаленага да свайго прыватнага жыцця.

### 5. «Гэта так проста!»

Такая фраза можа быць непрыемная кіраўніку, а калі яе яшчэ вымавіць паблажлівым тонам, яна напэўна выкліча крыўду. Нават калі супрацоўнік проста хоча паказаць, што задача для яго лёгкавыканальная.

### 6. «Гэта каму-небудзь трэба?»

Задаючы такое пытанне, вы ставіце пад сумнеў мэтазгоднасць працы, а гэта непрыемна не толькі вам, але і кіраўніку. Бо ён жа невыпадкова даў вам шмат часу на выкананне задання, а каб застрахавацца сябе ад памылак.

### 7. «Гэта не мае абавязкі»

Слухайце, многае з таго, чым вы займаецеся ў працоўны час, не ўваходзіць у вашы службовыя абавязкі. Напрыклад, перапіска з сябрамі або чытанне навінаў у інтэрнэце. А значыць, калі шэф папросіць пра якую дробязь, не трэба адразу заяўляць аб сваіх правах і абавязках.

### 8. «Гэта не мая праблема»

Фраза ўсё ж прадугледжвае наяўнасць пэўнай праблемы, дый у дапамозе мае патрэбу альбо калега, альбо сам бос. Таму не варта лішні раз падкрэсліваць адасобленасць ад калектыву, лепш паспрабаваць дапамагчы.

### 9. «І гэта ўсё?»

Словы могуць тычыцца чаго заўгодна: ад новых офісных тэлефонаў да страваў на карпаратыўным свяце. Аднак кіраўніку фраза сігналізуе, што вы расчараваныя і не цэніце намаганняў, што робяцца для паляпшэння ўмоваў працы.

### 10. «Гэта невыканальна»

Гэта фраза сігналізуе шэфу, што супрацоўнік, магчыма, абыякавы да справы. Не варта адразу адмаўляцца ад задання. Лепей добра ўзважце і абдумайце, як за тое ўзяцца.

**КаМ паводле AskMen.com**

ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

## У Гродне на свет з’явіліся шпакі-альбіносы

Сям’я Маскалёвых гадуе іх на балконе.



Колькі гадоў таму сям’я Ганны Маскалёвай паставіла побач са сваім балконам некалькі шпакоўняў. А сёлета ў адной іх на свет з’явіліся адразу два шпакі-альбіносы.

Альбінізм — рэдкая з’ява ў жывёльным свеце. Як у любога альбіноса, у іх адсутнічае пігментацыя. Вочкі і лапкі здаюцца ружовымі, дзякуючы сетцы маленечкіх крывяносных сасудаў, што падступаюць да паверхні.

Альбіносы рэдка выжываюць. Звычайна нават суродзічы адкідаюць іх. Хаця бацькі гэтых шпачкоў не кінулі і пастаянна прыносяць ім ежу.

Каб іх не задзяўблі вароны, Ганна пасяліла птушанятак у сябе на балконе.

На думку кіраўніка Гродзенскага абласнога аддзялення ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Дзмітрыя Вінчэўскага, птушаня-альбінос з’яўляецца прыблізна ў адным выпадку на мільён.

**prosto-free.livejournal.com**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб’ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА–версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

ЗДАРОЎЕ



## Што рабіць, калі сеў клешч?

За вясну ад кляшчоў у Беларусі пацярпела 6,1 тыс. чалавек.

Гэта ў 1,5 разу больш, чым летась. Кляшчы, на жаль, рассяляюцца ўсё шырэй па лясах і парках. Між тым, гэта смяротная небяспека — пагроза энцэфаліту і лайм-барэліёзу.

Каб не падхапіць кляшча, людзям раяць для адпачынку выбіраць чыстыя сонечныя, пясчаныя бары. Пры гэтым адзенне павінна максімальна закрываць цела.

Калі вас укусіў клешч, кропніце на яго алею і праз пэўны час пінцэтам выцягніце яго за брушка, а месца ўкусу апрацуйце ёдам. Пакладзіце кляшча ў слоік і вазьміце з сабой у паліклініку. Пры ўкусе кляшча ісці да доктара мусова! Кляшча адправяць на даследаванне і пры патрэбе вам прызначаць прафілактычнае лекаванне.

**Сяргей Гезгала**

ТЭХНАЛОГІІ

## «Вочы» расійскіх танкаў будуць рабіць у Беларусі

Міністэрства абароны Расіі збіраецца падпісаць з французскім канцэрнам Safran дамову аб пастаўках звышсучаснага абсталявання для расійскага спецназа.

Першая партыя будзе невялікай — Масква зацікаўленая ў набыцці ліцэнзіі на вытворчасць уласных узораў зброі і абсталявання.

У прыватнасці, 15 чэрвеня Расабаронэкспарт ужо падпісаў дамову з фірмай Thales. Французскі канцэрн прадаў расійцам ліцэнзію на вытворчасць тэрмавізійных камер для танкаў. Вытворчасць такога абсталявання плануецца наладзіць як у самой Расіі — у Волагдзе, так і за яе межамі — у Беларусі. Партнёрам расійскага абароннага ведамства мае стаць беларуская фірма «Пеленг».

**АП**

ЛЮБОШЧЫ

## Сэкс як дыета

Пра бялковую ці садавінавую дыету вы чулі, а што наконт сэкс–дыеты?

Першыя асацыяцыі да слова «дыета» — негатыўныя: змены ладу жыцця, абмежаванні, гаротны перыяд жыцця. Дык чаму не спалучыць прыемнае з карысным?

Фізічныя практыкаванні забяспечваюць нам здароўе. Але на зарадку то няма часу, то няма змогі. То, прынамсі, не забывайцеся пра сэкс. Для абдымкаў таксама трэба энергія: за раз спальваецца ажно 200 калорыяў.



Нямецкія навукоўцы з Цэнтра здаровага ладу жыцця ў Рэйдэльбергу зрабілі выснову, што самая «энергаэфектыўная» поза — стоячы. Гэтак спальваецца максімальная колькасць калорыяў. За два тыдні «трэніровак» пары, што бралі ўдзел у эксперыменце нямецкіх навукоўцаў, схуднелі на трыпяць кілаграмаў кожны. Як заўсёды: нязручна, але карысна.

Акрамя гэтага, любошчы павышаюць цягавітасць сэрца і змяншаюць рызыку сардэчных захворванняў. Сувязь паміж любошчамі і даўгалецем даследавалася шматкроць: даўно даведзеная наўпростая сувязь паміж упарадкаваным шлюбным жыццём і колькасцю пражытых гадоў.

Сёння вечарам вы настроеныя пачуццёва, хочацца дотыкаў, пешчаў... Але ж сэкс на поўны жывот — не вялікае што. Таму замест шкоднага не толькі для радасці вашай палавіны, але і для фігуры вечаровага аб’ядання — гайда ў ложак.

**Сямён Цыбульскі**

## Шлюб з маладзейшай за сябе падаўжае жыццё мужчыны

Але самыя моцныя пары ўтвараюць аднагодкі.

Спецыялісты таксама адзначаюць, што мужчыны ў шлюбе жывуць даўжэй за халасцякоў, а жаніцьба з маладзейшымі за сябе жонкамі яшчэ больш падаўжае жыццё. У той жа час для жанчыны найбольш пасуе шлюб з мужчынам прыкладна тых жа гадоў.

Раней лічылася, што і жанчынам шлюб з маладым мужам падаўжае век, але высветлілася, што пры значнай розніцы ва ўзросце з мужам (незалежна ад таго, у які бок) працягласць жыцця ў жанчын меншая. Псіхолагі мяркуюць, што прычына ў тым, што МНОГІЯ рознаўзроставыя пары ўрэшце адчуваюць псіхалагічны дыскамфорт.

Даследчыкі, вывучыўшы дадзеныя аб амаль двух мільёнах шлюбных пар, пацвердзілі здагадку, што замуж выходзіць лепш за равеснікаў, калі розніца ва ўзросце не перавышае 1—2 гады. І малады, і стары мужы аднолькава негатыўна ўплываюць на працягласць жыцця жанчын.

У той жа час адзначаецца, што жанчыны часцей расчароўваюцца ў мужу, старэйшым за сябе больш чым на 10 гадоў, і пакідаюць яго. Такія сем'і часцей распадаюцца. А вось аднагодкі ўтвараюць самыя моцныя пары.

**СЦ**

# Купалле



PHOTO.BYMEDIA.NET

Гэта макаўка лета, свята найбольшага росквіту прыродных сілаў. І самае папулярнае традыцыйнае свята.

Моладзь скача праз вогнішча. Калі хлопец мае пару, то пераскоквае агонь разам з дзяўчынай. Калі ў час скакання праз агонь у закаханай пары рукі не расчэпяцца — добрая прыкмета.

А яшчэ ў гэтую ноч варта разам з каханай знайсці папараць-кветку, каб быць здаровымі, шчаслівымі і мець грошай.

### Гомельшчына: дуда

**Ноч з 23 на 24 чэрвеня. Рэчка Іпуць ля Добруша (Гомельшчына).** Ладзіць Купалле моладзевая арганізацыя «Талака». Час ад'езду з Гомеля: 12.10 і 16.10 (збор ля ўваходу ў прыгарадны чыгуначны вакзал). Арганізатары просяць апрануць нацыянальныя строі або прынамсі нешта белае, захапіць ежу для святочнага стала, 3-тысячную складку на дудара, а таксама пазітыўны настрой. Для ўдзелу ў рэпетыцыях гомельскага Купалля тэлефануйце (029) 341-66-04, Ларыса.

### Строчыцы: «Цешча»

**26 чэрвеня. Музей народнай архітэктуры і побыту пад Мінскам.** У Строчыцах на Купалле — абход хат, спальванне старызны і народныя спевы. Запрошаныя фальклорныя калектывы «Асалода» і «Цешча». **Пачатак блізу 15-й**, але можна прыехаць і раней, бо музей адчыняецца а 10-й ранку.

### Лондан: талака

**26 чэрвеня. Беларускі рэлігійна-культурны цэнтр у Лондане (39, Holden Road).** У купальскай праграме лонданскіх беларусаў — народныя спевы і танцы. Пажадана па магчымасці быць у нацыянальным адзенні. Перад святкаваннем адбудзецца невялікая талака па добраўладкаванні двара Беларускага цэнтра. **Пачатак а 17-й.**

Дарэчы, Беларускае Купалле ў парку «Уорд Паунд Рыдж Рэзэрвэйшн» каля Нью-Ёрка ўжо адбылося 19—20 чэрвеня. Купальскі вечар пачаўся з прызначэння Князя-Купаліша і Купалінкі, якія распалілі вогнішча. Цана ўдзелу складала $25 для дарослых, $10 для дзяцей меншых за 12 год.

У тыя ж дні адбылося Купалле і ля Музея драўлянага дойлідства на беразе Ангары (Расія, Сібір). Іркуцкае Таварыства беларускай культуры сёлета пачало свята з ігры на дудзе.

### Манрэаль: з крупнікам

**У ноч з 26 на 27 чэрвеня за 80 кіламетраў на поўнач ад Манрэаля**, на маляўнічым узбярэжжы ракі таксама адбудзецца святкаванне Купалля.

На свяце будуць абавязковыя карагоды ды скокі праз вогнішча пад традыцыйныя купальскія спевы. Крупнік ды танцы з гульнямі пад беларускую дуду не дадуць удзельнікам замерзнуць ці сумаваць.

### Таронта: вяночкі на возеры Манітоўвабінг

**У ноч з 10 на 11 ліпеня** беларусы Таронта збіраюцца на Купалле ў традыцыйным месцы — **на тэрыторыі Цэнтра адпачынку «Слуцак», што знаходзіцца за 250 км на поўнач ад Таронта**. На Купаллі будзе ўсё, чаму належыць быць: песні, карагоды, скокі праз вогнішча і пад гармонік; «цёмныя сілы» будуць намагацца скрасці Купалінку, але Князь-Купаліш з дружынаю абавязкова выратуе яе; пад раніцу па возеры Манітоўвабінг паплывуць купальскія вяночкі з запаленымі свечкамі...

### Мінск, «Рэактар»: рок

**29 чэрвеня. Клуб «Рэактар» (Харужай, 29), Мінск.** Купальскае афтэр-паці. Ва ўмовах, максімальна набліжаных да старажытных, у сталічным клубе адбудзецца штогадовы фэст «Купальскае кола» з удзелам гуртоў **«Палац»**, **Testamentum Terrae**, **Unia**, **Рокаш**, **«Гуда»**, **«Ліцвіны»**, **P.L.A.N. Пачатак а 18-й.** Квіткі: 20 000 папярэдне (плюс кампакт-кружэлка ў падарунак), 25 000 — месца за столікам, у дзень канцэрта 25 000—30 000.

**Лявон К**

# Будслаўскі фэст



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

1 і 2 ліпеня ў Будславе, на Мядзельшчыне, адбываецца фэст у гонар Маці Божай Будслаўскай, Апякункі Беларусі.

Традыцыя пілігрымак у Будслаў аднавілася за незалежнасцю, на пачатку 1990-х. Ад таго часу тысячы вернікаў з Беларусі і ўсяго свету,каталікоў і праваслаўных, прыходзяць да касцёла пакланіцца абразу Нябеснай Апякункі Беларусі. Фэст у Будславе зрабіўся самым велічным, урачыстым і, зрэшты, самым беларускім святам краіны.

Кульмінацыяй фэсту з'яўляецца ўрачыстае шэсце з цудатворнай іконай. Дзясяткі тысяч людзей з запаленымі свечкамі абыходзяць цэнтральную плошчу мястэчка і вяртаюцца да касцёла. Нібы жывая вогненная рака плыве перад велічнай базілікай. Гэта прыгожы і велічны момант, які абавязкова трэба пабачыць на свае вочы, каб адчуць гісторыю і ўрачыстаць свята Маці Божай Будслаўскай.

**НШ**

### 1 ліпеня, чацвер

**13.00—17.00** — сустрэча і прывітанне пілігрымаў.

**18.00** — святая Імша для пілігрымаў.

**20.30** — Акафіст (хор грэка-каталіцкай Царквы).

**21.00** — марыйныя Нешпары (ксяндзы-салезіяне).

**23.00** — святы Ружанец (айцы-кармеліты).

**24.00** — працэсія і святая Імша (цэлебруе арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч; спеў — мінская парафія Найсвяцейшай Тройцы (Св. Роха) на Залатой Горцы).

### 2 ліпеня, пятніца

**02.00** — моладзевая праграма ў палатачным гарадку (гурт «Небасхіл»; Алеся Унукоўская).

**02.00** — святая Імша паводле грэка-каталіцкага абраду (перад абразом Маці Божай).

**04.00** — адарацыя Найсвяцейшага Сакрамэнту (у базыліцы).

**05.30** — Гадзінкі аб Беззаганным Зачацці Найсвяцейшай Панны Марыі на польскай мове (спеў — пілігрымы).

**06.00** — святая Імша перад абразом Маці Божай (цэлебруюць айцы-бернардыны).

**07.30** — святы Ружанец (ксяндзы-марыяне).

**08.30** — святая Імша на польскай мове ў базыліцы (цэлебруюць арцыбіскуп Варшаўска-Пражскі Хенрык Хосэр і айцы-новапрэсвітэры).

**10.00** — прэзентацыя Кампендыя ККК на беларускай мове (арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч) і прадукцыі выдавецтва «Про Хрысто».

**10.30** — святая Імша (цэлебруюць біскупы Беларусі; спеў — хор мінскай архікатэдры «Gloria»).

Выстаўленне Найсвяцейшага Сакрамэнту, працэсія.

Гімн Te Deum laudamus.

**13.00** — святая Імша на польскай мове (біскуп Антоні Дзям'янка)

## ФЕСТЫВАЛІ

### Be2gether

**25—27 чэрвеня.** Музычны фэст на літоўска–беларускім памежжы Be2gether. **Ля вёскі Нарвілішкі** можна будзе пачуць сусветна вядомыя гурты — **Skunk Anansie**, **Empire Of The Sun** (Аўстралія), **Roots Manuva**, **«Гайдамаки»** (Украіна), **«Рубль»** (Расія). Беларусь на фестывалі прадставяць гурты **CherryVata**, **Open Space**, **Akute** і, вядома, **Лявон Вольскі** з праектам на словы класічных паэтаў «Белая яблыня грому».

### Наваградскі замак — 2010

**25—27 чэрвеня.** У тыя самыя дні **ў Навагрудку** адбудзецца Пяты фэст сярэднявечнай культуры «Наваградскі замак — 2010». Ён прысвечаны 600-годдзю Грунвальдскай бітвы. У праграме: тэатралізаваныя шэсці на чале з Вітаўтам і Ягайлам, турніры, фэст сярэднявечнай музыкі. На дэсерт — штурм крыжакамі Наваградскага замка.

### Global Gathering Freedom Music

**26 чэрвеня.** Фэст электроннай музыкі Global Gathering Freedom Music адбудзецца **на аэрадроме «Баравая», ля мінскай кальцавой**. На вольным паветры можна будзе патанчыць пад сусветную суперзорку ды-джэя **David Guetta**. Галоўнае, каб не пайшоў дождж.

## КАНЦЭРТЫ



### Элтан Джон

**26 чэрвеня ў «Мінск-Арэне» (пр. Пераможцаў, 111)** адбудзецца канцэрт англійскага кампазітара і спевака, кавалера ордэна Брытанскай імперыі Элтана Джона. **Пачатак а 20-й.**

### Ноч музыкі ў Філармоніі

Класічна прабаўленая купальская ноч: узлесак, вогнішча, карагод? Не: Філармонія, Шапэн, мазурка. Познім вечарам **23 чэрвеня ў будынку на плошчы Якуба Коласа пройдзе «Ноч музыкі»**. **Ад 19-й да 24-й** дзверы музычнай установы будуць адчыненыя для наведнікаў. Шапэнаўскія творы прагучаць і ў выкананні аўтэнтычных інструментаў — так, як некалі чуў іх сам Шапэн. Кульмінацыяй фестывалю зробіцца спектакль «Жорж Санд, мазурка і Шапэн», дзе ў ролі Кансуэла мы ўбачым Святлану Зелянкоўскую.

## ВЫСТАВЫ

### Музей сучаснай беларускай моды

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12)** праходзіць выстава «Пачатак. Музей сучаснай беларускай моды». Гэта сумесны праект беларускіх дызайнераў і супрацоўнікаў музея, які адлюстроўвае сучасныя тэндэнцыі ў развіцці беларускай моды. Працуе **да 29 жніўня**.

### Беларусь XVI—XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы

Выстава «Беларусь XVI—XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы» працуе **ў Нацыянальным гістарычным музеі РБ (вул. Маркса, 12) да канца года**.

## ТЭАТРЫ

**23 чэрвеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»
**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»

**24 чэрвеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепей»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»
**Тэатр оперы і балета** — «Стварэнне свету»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»

**25 чэрвеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Палёты з анёлам»
**Тэатр оперы і балета** — Вечар старадаўняга раманса
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»

**26 чэрвеня**

**Музычны тэатр** — «Мефіста»
**Купалаўскі тэатр** — «Больш чым дождж»
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Поле бітвы»

**27 чэрвеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Усяго патроху»
**Купалаўскі тэатр** — «Макбет»
**Тэатр імя Горкага** — Каралеўскі балет «Cracovia Danza» (Польшча)
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Беларусь у фантастычных апавяданнях»
**Тэатр оперы і балета** — «Вяселле Фігара»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Поле бітвы»

**28 чэрвеня**

**Тэатр-студыя кінаактора** — «Майстар і Маргарыта»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»
**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»

**29 чэрвеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Філумена Мартурана»
**Тэатр оперы і балета** — «Рамэа і Джульета»
**Купалаўскі тэатр** — «Сымон-музыка»
**Музычны тэатр** — «Чырвоны Каптурок. Пакаленне NEXT»

**30 чэрвеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Тры парсючкі»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Тэатр оперы і балета** — «Багема»
**Музычны тэатр** — «Мефіста»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»

## КІНО

### Двайны капец Бруса Уіліса

**CopOut**

ЗША, 2010, каляровы, 107 хв.

**Рэжысёр:** Кевін Сміт

**Ролі выконваюць:** Брус Уіліс, Трэйсі Морган, Хуан Карлас Хернандэз, Коры Фернандэз

**Жанр:** Камедыйны «напарніцкі» баявік

**Адзнака:** 2,5 (з 10)



У цэнтры сюжэту — два сябры-паліцэйскія, ёлупні, якія вечна трапляюць у дурныя сітуацыі. У дадатак героі ўвязваюцца ў прыгоды з наркамафіяй.

Пара ўдалых сцэнак, пара ўдалых жартаў, Брус Уіліс... І гэта ўсё.

**Андрэй Расінскі**

# На двух колах па краіне

Цікавыя веласіпедныя маршруты па Беларусі.

Умоўна іх можна падзяліць на дзве групы — «афіцыйныя» і «неафіцыйныя». Першыя — распрацаваныя турыстычнымі структурамі. Лідэрства ў гэтай сферы належыць Белавежскай пушчы.

### Дзед Мароз і дзікія звяры

Супрацоўнікі нацыянальнага парку распрацавалі чатыры веламаршруты — ад 10 да 45 км. Неабходнае абсталяванне даюць на месцы. У дадатак тут разбудаваная інфраструктура з кавярнямі, рэстаранамі і гандлёвымі радамі. А цікавостак у Пушчы шмат — ад Дуба-патрыярха і Царскага тракта да Дзеда Мароза і дзікіх звяроў.

Праходзіць маршруты па Пушчы можна як самому, так і групай да 16 чалавек. Тут жа, на мяжы з Польшчай, дзейнічае памежны пункт пропуску для арганізаваных ровараў. Маючы жаданне і візу, можна заехаць роварам у суседнюю краіну.

Турыстычны цэнтр Белавежскай Пушчы — (01631) 56–398, beltour07@mail.ru

### Тры краіны за тыдзень

Іншы відовішчны веламаршрут — Аўгустоўскі шлях. Ён называецца «За сем дзён у тры краіны на роварах і байдарцы». Прапануецца наведаць Беларусь, Польшчу і Літву па шляху Аўгустаў — Мікашоўка (Польшча) — памежны пераход «Рудаўка Лясная» (шлюз «Кужынец», шлюз «Ваўкушак» — Дамброўка — шлюз «Дамброўка» — Сапоцкін — Гродзенскі ўмацаваны раён № 68 (Лінія Молатава) — форт Гродзенскай крэпасці — Санічы — рэчкі Марыха, Чорная Ганьча, Шляміца, азёры Яндрэня, Кавеня, Савек — Нямнова — памежны пераход «Пералом» — Друскенікі (Літва).

Як і ў Белавежы, на Аўгустоўскім канале велатурыстам прапануюць арандаваць усё неабходнае.

У наваколлі ёсць аграсядзібы, гатэлі і іншыя пункты абслугі турыстаў. Узровень абслугоўвання пакідае жадаць лепшага, аднак інфраструктура паступова развіваецца.

Гэты маршрут, акрамя шэнгенскай візы, патрабуе ад турыстаў падрыхтоўкі, каб вытрымаць фізічныя нагрузкі. Кампенсацыя за гэта — краявіды трох краін.

Інфармацыю пра маршруты па Аўгустоўскім канале можна атрымаць у большасці беларускіх турфірм. Альбо непасрэдна ў фірме «Нямнова Тур».

«Нямнова Тур» — тэл. +375 152 74–29–43. E-mail: nemnovotour_grodno@tut.by



Для аматараў ровара, што любяць падарожнічаць вольна, раім некалькі маляўнічых мясцінаў, злучаных адносна непрацяглымі пераездамі.

### Стоўбцы — Мір — возера Кромань — Налібоцкая пушча — Коласава — Койданава

Маршрут складаны, разлічаны на два дні з адной начоўкай. Але хто прайшоў яго — не забудзеца. Акрамя магчымасці наведаць знакаміты Мір, падарожжа дазволіць адпачыць сярод дзікай прыроды. Возера з Пушчай гэтаму паспрыяюць.

Да Стоўбцаў можна дабрацца электрычкай. Пры нагодзе ў мястэчку можна пабачыць Нёман, тут яшчэ зусім невялікі.

Сядзібы: «У опушки», Налібоцкая пушча, Стаўбцоўскі раён, т.: (029) 674–70–74 (Вольга), 348–70–41 (Зміцер)

«Стары млын», каля в. Ячанка, Стаўбцоўскі раён, т.: (029) 641–23–22 (Алег), 674–70–74 (Вольга)

### Асіповічы — уздоўж Пцічы — Мар'іна Горка

Яшчэ адзін цікавы двухдзённы маршрут пачынаецца з Асіповічаў. Дабраўшыся туды электрычкай, можна далей скіравацца ўздоўж ракі Пціч па вялікай дузе да Мар'інай Горкі.

Што праўда, з аграсядзібамі ў тых ваколіцах складана. Бярыце намёты.

Пціч неверагодна прыгожая. Кожныя некалькі гадзін маршрут будзе праходзіць праз месцы зліцця гэтай павольнай ракі з яе шматлікімі прытокамі: Шаццю, Даколькай, Арэсай, Асачанкай, Нератоўкай, Няслаўкай...

### Блакітныя Азёры

Маршрут па Блакітных Азёрах пралягае праз Нарач — Швакты — Балдук — Глублю.

Тут вас чакаюць сапраўдныя прыродныя дзівосы — Лысая гара, звярыныя сцежкі, завалы паваленых дрэваў ды пахкія балотныя ягады.

Як няма ўласнага транспарту, дабірацца да Нарачы складана. З Мінска прыйдзецца даехаць да Маладзечна, а адтуль ужо дызелем у кірунку Нарачы (найбліжэйшая станцыя — Княгінін). Падобным чынам і назад у сталіцу. Пры адсутнасці ў Беларусі спецыяльных вагонаў для перавозу ровараў, такое падарожжа можа ператварыцца ў пакуты.

Сядзіба: «Нарачанка», вул. Падлесная, 12, в. Нарач, Мядзельскі р–н, т.: (01797) 49–0–84, (01797) 55–0–39

Гэта далёка не поўны пералік магчымых трасаў. У ваколіцах кожнага вялікага горада знойдзецца мноства цікавых мясцінаў, куды можна даехаць роварам.

Спрактыкаваны раварыст можа за дзень адолець 70 км шляху, пры гэтым знойдзецца час і на азнаямленне з наваколлем. Падарожнічаючы з малодшымі школьнікамі, не варта планаваць пераходаў, даўжэйшых за 10—20 км.

Выпраўляючыся ў падарожжа па «дзікім» маршруце, варта браць з сабой прылады, неабходныя для тэрміновага рамонту «жалезнага каня». Могуць быць і праблемы з начлегамі — з аграсядзібамі лепей дамаўляцца загадзя, а гатэльчыкі райцэнтраў даволі дарагія. Альтэрнатыва — намёты.

**Алесь Пілецкі**

**Ровары ў інтэрнэце**

velolife.by, poehali.net — сайты аматараў ровара ў Беларусі. Тут можна з дапамогай інтэрактыўнай мапы сфармаваць свой маршрут, знайсці спадарожнікаў і карысныя парады.

## Сціcла

• **Беларускі этнічны Дыснэйлэнд пабудуюць у мінскім мікраараёне Чыжоўка.** Побач з паркам 900-годдзя Мінска і заапаркам узвядуць сучасны забаўляльны комплекс. На 35 га размесціцца музей пад адкрытым небам «Беларуская спадчына». Праект прадугледжвае рыцарскія палацы, пякарні, млын. На «Сялянскім падворку» можна будзе адзначыць Купалле. «Панскі Фальварак» дасць магчымасць адчуць сябе шляхціцам XVIII ст.

• **Чарніцы і лісічкі падаражэюць.** У Беларусі павышаныя мінімальныя закупныя цэны на дзікарослыя расліны і грыбы ўраджаю 2010 года. За кіло лісічак дадуць мінімум 3000 рублёў, белых грыбоў — 3500, краснюкоў, абабак, маслякоў і іншых грыбоў — 1000 рублёў. Кілаграм чарніц каштуе мінімум 2600 рублёў, журавін — 1900, брусніц — 1800.

**БЕЛТА, БелаПАН**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Кальрабі звычайным спосабам

Некалькі штук кальрабі, 1 лыжка масла, соль, 1 лыжка мукі або цёртых сухароў, трохі булёну.

Абабраць і прамыць кальрабі, нарэзаць кубікамі і адварыць у падсоленай вадзе. Адцадзіць, палажыць у рондаль, заліць булёнам, каб закрываў гародніну, да смаку пасаліць, дадаць масла і тушыць да мяккасці. Пры канцы пакласці муку або цёртыя сухары, перамяшаць, яшчэ раз закіпяціць і падаць на паўміску, абклаўшы катлетамі з ялавічыны, скрылікамі вымя, або печані, або грэнкамі.

**З кнігі В. Завадскай «Літоўская кухарка», 1854 г.**

**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ВАЗЬМУ НА ПАДСЯЛЕННЕ**

**прыстойнага чалавека.** Двухпакаёўка. Блізка метро «Парк Чалюскінцаў». Т.: (029) 305–20–91. Сяргей

**СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ**

**Таварыства аховы помнікаў запрашае** ў падарожжа «Па азёрным краі» 20 чэрвеня. Тэл.: (029) 111–73–32; (017) 262–73–43.

**Запрашаем** у падарожжа ад 12 да 21 ліпеня 2010 г. па маршруце Чанстахова—Вена—Рым— Ватыкан—Фларэнцыя—Браціслава. Т.: (029) 618–72–99; 518–72–27.

**ПРАЦА**

**Пячнік-пенсіянер дапаможа** вам змайстраваць ці адрамантаваць любую печ альбо камін. Т.: (029) 609–53–61.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) Я — вада, а па вадзе плаваю.

2) Не агонь, а пячэцца.

3) Зімой у полі ляжыць, а ўвесну ў раллю бяжыць.

4) Мяне летам вельмі часта чакаюць, а калі з'яўляюся, дык хавацца пачынаюць.

**Сабрала Валянціна Карнялюк**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**

НЯБЕСНЫЯ БЕГІ

# Камета з дзвюма хвастамі

Прыблізна да 10 ліпеня ў небе над Беларуссю няўзброеным вокам можна будзе назіраць камету Макнота.

Камета названа ў гонар аўстралійскага астранома, які адкрыў яе летась. Гэта вялікае нябеснае цела: галава памерам перавышае дыяметр Юпітэра. У сярэдзіне чэрвеня камета наблізілася да Зямлі на самую блізкую адлегласць, якая складае прыкладна 170 мільёнаў кіламетраў.

Пры спрыяльных умовах назірання ў бінокль камета бачыцца як туманная пляма з двума хвастамі, адзін з якіх зялёны, а другі нагадвае белае воблака.

У другой палове чэрвеня камету рэкамендуецца назіраць перад узыходам сонца, у першай палове ліпеня — пасля заходу сонца на бясхмарным небе.

Паводле слоў дырэктара абсерваторыі БДУ Альгерда Кузнечыка, каметы, якія набліжаюцца да Зямлі настолькі, што іх можна бачыць няўзброеным вокам, адзначаюцца дастаткова рэдка — добра, калі раз на год.

Яшчэ адзін астранамічны дэлікатэс, які чакае нас у гэтыя дні: ад 22 чэрвеня да 2 ліпеня Зямля будзе праходзіць праз метэорны паток Баатыдаў. Колер метэорных успышак праз невялікую хуткасць патоку будзе чырванаватым. Праўда, бачныя яны на беларускім небе будуць горай за камету Макнота.

**Паводле БелаПАН**






У Мінску няма парада бландзінак. Затое ёсць парад нявестаў.

**8 чэрвеня ў самым цэнтры Мінска два рыцары біліся не на жыццё, а на смерць... падушкамі. Першы двубой адбыўся на плошчы Якуба Коласа, другі — ля Гандлёвага дома на Нямізе. Арганізатары перформансу кажуць, што гэта быў толькі пачатак. Вялікая бітва падушкамі яшчэ наперадзе. Правесці яе плануюць 15 ліпеня ў гонар 600-й гадавіны Грунвальдскай бітвы.**







**Моладзевыя актывісты зладзілі 18 чэрвеня на мінскай Камароўцы флэшмоб супраць указа № 60, які ставіць інтэрнэт-сайты пад кантроль. На першым плане — Франак Вячорка.**






**Проста грыб. Гэты разьбярскі шэдэўр заўважаны ў Віцебскай вобласці.**

## Анекдоты

Адкрыты ліст. Паважаныя куцюр'е, дызайнеры і ўсе, хто мае дачыненне да моды! Вельмі прашу, зрабіце так, каб у гэтым, наступным і далейшых сезонах было модна хадзіць у шкарпэтках рознага колеру, памеру і фасону.

* * *

Раней жонку я называў пілой, а цяпер клічу ласкава і пяшчотна — вувузела.

* * *

Набылі машыну для мыцця посуду. Цяпер у сям'і праблема — каму ў яе класці брудны посуд...

* * *

Колькі Пятровіч ні спрабаваў зрабіць з вады, дражджэй і цукру квас — увесь час выходзіла самагонка.

* * *

Курыцы прыйшла павестка ў суп.

## «НН» сто гадоў з вамі

**Нарвелішкі.** За лесам — рэшткіаграмністых муроў старадаўняга манастыра. Цяпер яшчэ стаіць вялізная званіца, але на месцы самога манастыра стаіць ужо толькі... крыж. Ніжэй жа збудаваны новы вялікі на два этажы дом. Тут вучаць цяпер маладых дзяўчатак розных гаспадарскіх работ.

**Ядвігін Ш. «Лісты з дарогі»**
**«НН». №26. 1910**

**«Лукашэнка памёр»**

Ах, якую цудоўную ноч мы правялі з адным беларускім актoрам у адным менскім стрыптызбары! Дзе менскія прыгажуні з целамі, нібы вырашчанымі ў інкубатары, колькі гадзінаў спакушалі нас сваімі нясціплымі танцамі. Дзе мы не шкадавалі грашовай масы, шчодра напаўняючы станікі й майткі ўсіх гэтых Клеа й Мэры роднымі купюрамі, тлумачачы, што мы — беларускія патрыёты. Дзе нішто, акрамя дэбільных выкрыкаў бандзюганаў за суседнім столікам, не выдавала сённяшнюю РБ.

Але за вокнамі пачынаўся новы шэры дзень, у зале запалілі святло. Мы з прыяцелем выйшлі на шэры пустынны праспект.

Дзве старыя алкагалічкі асцярожна перасоўваліся ў наш бок.

Тая, што маладзейшая, наблізілася да нас і сказала адну толькі фразу. З двух словаў. Сказала так, нібы жадала падзяліцца глыбокай асабістай радасцю з першымі сустрэчнымі. Сказала так, што недапітая бутэлька імгненна перайшла ў яе брудныя рукі.

«Лукашэнка памёр».

Толькі пасля да нас дайшло, што нас падманулі. Што хітрая бамжыха дакладна разлічыла, чым можна «ўзяць» двух беларускамоўных пахмельнікаў.

**Зміцер Бартосік**
**«НН». №24. 2000**

**Адказы на кемікі са старонкі 15.**

1) Лёд. 2) Крапіва. 3) Снег. 4) Дождж.

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6340.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 22.06.2010.
Замова №.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10023